*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛЮТАГА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 32
(26390)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ЕЎРАСАЮЗ УСВЕДАМЛЯЕ ЗНАЧЭННЕ БЕЛАРУСІ ДЛЯ ЕЎРОПЫ»



Фота БЕЛТА.

**Беларусі і Еўрапейскаму саюзу ў развіцці дыялога трэба выключыць пасрэднікаў. Такую пазіцыю беларускага боку агучыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 19 лютага на сустрэчы з генеральным сакратаром Савета Еўрапейскага саюза — Вярхоўным прадстаўніком па агульнай знешняй палітыцы і палітыцы бяспекі ЕС Хаўерам Саланам.**

«Я прасіў бы вас, каб у адносінах паміж Беларуссю і Еўропай мы пастараліся выключыць усялякіх пасрэднікаў, асабліва тых, якія дзейнічаюць з пазіцыі, не зусім добразычлівай у адносінах да нашай краіны. Я маю на ўвазе пасрэднікаў як унутры краіны, так і за яе межамі. А іх нямала», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«У мяне складваецца ўражанне, што цяперашні этап нашых адносінаў характарызуецца наяўнасцю нейкага «гандлю» паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам як па эканамічных, так і па палітычных пытаннях. Па прынцыпу: мы зрабілі вось гэта — вы цяпер зрабіце гэта. І пачынаецца нейкі дыялог у выглядзе «гандлю», што, напэўна, непазбежна ў палітыцы, але, з майго пункту гледжання, непажадана. Больш таго, гэта не трэба: Еўрапейскі саюз добра ўсведамляе, што такое сучасная Беларусь для Еўропы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пры гэтым адзначыў: «Мы тым больш уяўляем каштоўнасць Еўрапейскага саюза для нас як з пункту гледжання палітыкі, так і з пункту гледжання эканомікі, перш за ўсё эканомікі».

Той факт, што Беларусь і краіны ЕС звязваюць шматлікія ўзаемныя інтарэсы, — відавочны. Па аб'ёме знешнегандлёвага абароту Беларусі Еўрасаюз надзейна ўтрымлівае другое месца. У 2008 годзе беларускі экспарт у ЕС павялічыўся на 36 працэнтаў у параўнанні з 2007 годам і склаў $14,4 млрд. У цэлым на дзяржавы Еўрасаюза прыпадае найбольшы аб'ём беларускага экспарту — 44 працэнты (на Расію — 32 працэнты). Пры гэтым Беларусь з'яўляецца вельмі значным транзітным калідорам паміж Усходам і Захадам, забяспечваючы каля 30 працэнтаў паставак расійскага газу ў краіны ЕС і амаль 50 працэнтаў паставак нафты з Расіі. Наша рэспубліка таксама важная транспартная артэрыя, праз якую аўтамабільнымі і чыгуначнымі шляхамі штогод перамяшчаецца больш як 100 млн тон грузаў, прычым каля 90 працэнтаў з іх складаюць грузы з краін Еўрасаюза ў Расію і з Расіі ў дзяржавы ЕС.

У час гутаркі з Хаўерам Саланам Прэзідэнт падкрэсліў намер адкрыта выказаць «усё тое, што беларускі бок гатовы зрабіць для наладжвання абсалютна цесных, даверных узаемаадносінаў з Еўрапейскім саюзам».

«Гэта значыць я хачу вам сказаць, што мы можам сёння і заўтра зрабіць і чаго мы (у інтарэсах выключна нашай краіны, а не ў інтарэсах нейкіх асобаў) не можам. І калі ў нас будуць разыходзіцца пункты гледжання, я паспрабую на фактах вас пераканаць у тым, што мы праводзім шчырую палітыку адносна Еўрапейскага саюза, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы вельмі не хацелі б, каб у вас склалася ўражанне, што ў нас няма іншага выйсця, як бегчы ў адзін бок і падманваць еўрапейцаў, кіраўніцтва Еўрапейскага саюза. Мы такой мэты перад сабой ніколі не ставілі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што з'яўляецца прыхільнікам выключна сумленнай, шчырай палітыкі: «Мы будзем гаварыць праўду: што мы можам, а чаго не. Гэта і ў вашых інтарэсах».

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Хаўеру Салану за садзейнічанне ў наладжванні добрасуседскіх адносінаў паміж Беларуссю і Еўропай. «Зыходзячы з існуючай інфармацыі і маіх асабістых уражанняў, без Вас не было б гэтай размовы і таго пацяплення ў адносінах, якое адбываецца цяпер», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Генеральны сакратар Савета ЕС заявіў, што «Еўрапейскі саюз разглядае Беларусь як еўрапейскую краіну». «І гэта абсалютна нармальнае развіццё сітуацыі, калі паміж Беларуссю і Еўрасаюзам будуць нармальныя ўзаемаадносіны», — падкрэсліў Хаўер Салана.

Генеральны сакратар Савета Еўрасаюза, які ўпершыню прыбыў у Беларусь з візітам, пазітыўна ацаніў падрыхтоўку бакоў да перагавораў у Мінску і выказаў гатоўнасць весці «адкрытую, сумленную, шчырую размову».

«Я вельмі задаволены, што прыбыў сюды. Пераканаены, што наша гэта гутарка будзе плённай і канструктыўнай для двухбаковых адносінаў. Спадзяюся, што гэта стане асновай, на якой нашы ўзаемаадносіны могуць развівацца і ў далейшым, — сказаў Хаўер Салана. — Буду з Вамі таксама абсалютна шчыры, як і Вы са мной».

Падчас размовы, што працягвалася амаль паўтары гадзіны, абмеркаваны розныя аспекты ўзаемадзеяння Беларусі і ЕС, а таксама сітуацыя ў свеце ў сувязі з фінансава-эканамічным крызісам. На думку Хаўера Саланы, цяперашняя складаная эканамічная сітуацыя «будзе мець і глабальныя палітычныя наступствы».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




*Вёска Пруднікі Докшыцкага раёна.*

## Сусветны крызіс абавязвае Беларусь і Латвію інтэнсіфікаваць супрацоўніцтва

**Беларусі і Латвіі неабходна захаваць высокую дынаміку ўзаемнага гандлю. Аб гэтым заявіў 19 лютага Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Латвіі Іварсам Годманісам.**

Двухбаковы тавараабарот у мінулым годзе склаў $2,32 млрд і ў параўнанні з 2007 годам вырас больш як у два разы. Экспарт з Беларусі павялічыўся ў 2,2 раза да $2,18 млрд. «Дай Бог у гэты складаны час захаваць высокую дынаміку гандлю. Можа быць, і будзе нейкі спад, але каб ён быў абгрунтаваным, аб'ектыўным працэсам. Аднак лепш утрымацца на гэтай вышыні», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Асноўны прырост беларускага экспарту ў 2008 годзе забяспечаны за кошт нафтапрадуктаў. Сярод іншых значных тавараных пазіцый — прадукцыя хімічнай галіны, паўфабрыкаты і пруткі з вугляродзістай сталі, трактары. У імпарце з Латвіі пераважаюць рыба мароджаная і кансерваваная, кармы для жывёл, лекавыя сродкі, металаканструкцыі, тканіны.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў прэм'ер-міністру Латвіі не толькі за палітыку, якую Латвія праводзіць у адносінах да Беларусі, але і за яго асабісты ўклад і разуменне сітуацыі, за той узровень узаемаадносінаў, які складваецца з Латвіяй.

З 2005 года штогод праводзяцца пасяджэнні беларуска-латвійскай міжурадавай камісіі па эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, двухбаковыя інвестыцыйныя форумы, арганізоўваюцца візіты дзелавых колаў. У 2002—2008 гадах у эканоміку Беларусі паступіла каля $600 млн латвійскіх інвестыцый. За 2008 год, нягледзячы на крызіс у эканоміцы Латвіі, прыцягнута $97,7 млн інвестыцый, у тым ліку $36 млн — прамых. Латвія адыгрывае важную ролю як краіна — транзіцёр беларускіх грузаў, у першую чаргу нафтапрадуктаў і калійных угнаенняў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што з задавальненнем абмяркуе тыя праблемныя пытанні, якія існуюць ва ўзаемаадносінах дзвюх краін, і запэўніў, што «калі іх прычына ў Беларусі, то ўсе праблемы будуць вырашаны кардынальна і ў бліжэйшы час».

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Латвіі падкрэсліў, што тая сітуацыя, якая склалася ў свеце, абавязвае краіны інтэнсіфікаваць супрацоўніцтва. Ён адзначыў, што ў Беларусі эфектыўная эканоміка і Латвія можа прапанаваць свае канкурэнтаздольныя паслугі, у прыватнасці, па выкарыстанні партоў, чыгуначнай інфраструктуры. Ён таксама лічыць, што ў Беларусі і Латвіі ёсць добрыя магчымасці для пашырэння супрацоўніцтва ў сферы інвестыцый. «Мы павінны стварыць не толькі адпаведны клімат, але і гарантаваць бяспеку гэтых інвестыцый», — сказаў ён. Прэм'ер-міністр Латвіі таксама дадаў, што ў дзвюх краін ёсць добрая аснова для стварэння сумесных прадпрыемстваў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ХАБАР ЗА АРЭНДУ

**У сваім працоўным кабінеце супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі затрымалі 50-гадовага гамяльчаніна, кіраўніка Гомельскага прадпрыемства рабочага забеспячэння.**

За год ён атрымаў ад жыхара Рэчыцы ў якасці хабару 650 долараў ЗША — за заніжэнне платы за арэнду памяшкання ў вёсцы Азёршчына, што ў Рэчыцкім раёне.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## У ВЫХАДНЫЯ — ДА МІНУС 20

Пад уплывам моцнага антыцыклону з боку Верхняга Паволжа з пятніцы на тэрыторыі Беларусі пачне павялічвацца атмасферны ціск, паведаміла рэдакцыі **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.** У выхадныя чакаецца марознае надвор'е, месцамі пройдзе невялікі снег. Тэмпература паветра ўначы мінус 6—13 градусаў, пры праясненнях да 15—20 марозу, удзень — мінус 1—8 градусаў. Згодна з папярэднімі прагнозамі, марознае надвор'е захаваецца і да сярэдзіны наступнага тыдня. Ападкаў амаль не будзе, толькі ў асобных раёнах магчымы невялікі снег. Тэмпература ўначы 5—12, пры праясненнях да 14—18 марозу, удзень — мінус 2—8.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЯК НАС ДУРАЦЬ

## Прыйшоў «сацыяльны работнік» — зніклі грошы

Менавіта такім спецыялістам адрэкамендавалася невядомая, якая завітала ў кватэру пенсіянеркі па вуліцы Горкага ў Гродне. Пасля яе сыходу з шафы зніклі грошы — 1 мільён 230 тысяч рублёў, 50 долараў і 15 еўра. А праз двое сутак ад «сацработнікаў» пацярпела пенсіянерка, якая пражывае па вуліцы Пушкіна — яна пазбавілася трох залатых вырабаў. Іншым спосабам дзейнічаў у Зэльвенскім раёне яшчэ адзін аферыст — ужо раней судзімы жыхар тутэйшай вёскі Дзергілі, які называўся пажылым людзям супрацоўнікам пажарнай службы. Маўляў, за няспраўнасць пячнога ацяплення трэба заплаціць штраф. Жыхарка вёскі Калінаўка аддала махляру 25 тысяч рублёў, а пенсіянерка з вёскі Холстава — 23 тысячы. Зламыснік затрыманы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

БПС-БАНК

**С 23 февраля 2009 г. ОАО «БПС-Банк» вводит дополнительные условия по срочным банковским депозитам в белорусских рублях**

**«ВАШ ВЫБОР», «ПРАКТИЧНЫЙ», «ПАРТНЕРСТВО»:**

«- при досрочном расторжении депозита в белорусских рублях (по истечении 3-х месяцев со дня размещения депозита) и переоформлении в Банке на другой вид депозита в белорусских рублях перерасчет процентов не производится.»

**Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на веб-сайте (www.bpsb.by) или по телефону – 148 (бесплатно в стационарной сети).**

**Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.**

Проценты, выплаченные по вкладам в белорусских рублях в течение 2008 г. (млрд. руб.): январь — 4,2; февраль — 4,2; март — 4,8; апрель — 4,9; май — 5,8; июнь — 5,8; июль — 6,1; август — 5,9; сентябрь — 6,7; октябрь — 6,4; ноябрь — 6,1; декабрь — 5,9.

Проценты, выплаченные по вкладам в иностранной валюте в течение 2008 г. (млрд. руб.): январь — 2,5; февраль — 2,5; март — 2,9; апрель — 2,9; май — 2,5; июнь — 3,1; июль — 3,2; август — 3,0; сентябрь — 3,4; октябрь — 3,1; ноябрь — 2,3; декабрь — 4,1.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк»*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АНТЫКРЫЗІСНАЯ ЭКАНОМІКА

### БУДАЎНІКІ ПРАГНАЗУЮЦЬ СЯРЭДНЮЮ ЗАРПЛАТУ Ў ПАЎТАРА МІЛЬЁНА

**Апошнім часам у Беларусі не адбылося масавага спынення работы будаўнічых арганізацый. Аб гэтым у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» паведаміў старшыня Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Віктар БАНДАРЧУК.**

Рэаліяй для галіны з'яўляецца нізкая рэнтабельнасць, недахоп абаротных сродкаў, сродкаў бюджэту і заказчыкаў. Вынікам гэтага стала пэўнае стрымліванне росту заплаты. Разам з тым, паводле звестак прафсаюза, на сёння арганізацыі галіны не пайшлі на зніжэнне тарыфнай стаўкі І разраду. Да таго ж, як паведаміў Віктар Бандарчук, галіновае тарыфнае пагадненне вызначае: у снежні сярэдняя зарплата ў сферы будаўніцтва і прамысловасці будматэрыялаў павінна выйсці на адзнаку ў 1,5 млн рублёў. Прычым на сёння дасягнутая папярэдняя дамоўленасць, што «планка» росту можа быць павялічана па выніках работы за першае паўгоддзе.

**Сяргей ГРЫБ.**

### ПАЖАР НА МНПЗ ЛІКВІДАВАНЫ

Ноччу, у 01.15 па нявызначанай пакуль прычыне пачаўся пажар на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе. Полымя пашкодзіла 15 квадратных метраў цеплаізаляцыі на тэхналагічнай калоне, прызначанай для дзялення нафты на фракцыі і адпраўкі яе на далейшую перапрацоўку. У ліквідацыі пажару па самым высокім нумары складанасці брала ўдзел 5 аўтацыстэрнаў. Пажар быў затушаны ў 2 гадзіны 20 хвілін. Тэхналагічны працэс на прадпрыемстве не быў парушаны. Страты падлічваюцца.

А на Гомельскім мясакамбінаце ўвечары гарэла бытоўка памерам 3 на 4 метры, размешчаная ў аднапавярховым цагляным гаражы. Работнікі ўчастка, адзенне якіх знішчыла полымя, выклікалі выратавальнікаў, і пажар быў ліквідаваны. Прычына высвятляецца, але ж, хутчэй за ўсё, мела месца небяспечнае абыходжанне з агнём. Людзі ў абодвух выпадках не пацярпелі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### «НУМІЗМАТ» У СТАМБУЛ НЕ ПАТРАПІЎ

Дзве залатыя манеты часоў Расійскай імперыі вартасцю ў 10 рублёў канфіскаваныя ў грамадзяніна нашай краіны супрацоўнікамі мытні «Мінск-2» падчас афармлення авіярэйса ў Стамбул. Прадметы нумізматыкі не былі задэклараванымі і аказаліся знойдзенымі толькі падчас агляду асабістых рэчаў пасажыра. Зараз залатыя манеты перададзеныя на экспертызу для вызначэння іх гістарычнай і культурнай каштоўнасці. Дарэчы, як падкрэслілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, усе прадметы, якія ўяўляюць такую каштоўнасць, могуць вывозіцца з Беларусі выключна пры наяўнасці спецыяльнага дазволу Міністэрства культуры. І ў тым ліку гэта датычыцца манет, якія былі выраблены да 1960 года ўключна.

**Сяргей ГРЫБ.**

### ПЛАНТАЦЫЯ КАНОПЛЯЎ У ПРЫВАТНЫМ ДОМЕ



Нават супрацоўнікі міліцыі былі здзіўленыя, калі пабачылі расліны, з веданнем справы высаджаныя ў разнастайныя ёмістасці ў прыватным доме. Іх памер дасягаў трох метраў. 13 вялізных канопляў стваралі такі водар, што ў пакоях цяжка было доўга знаходзіцца. Больш за тое, 38-гадовы гаспадар хатняга садочка пільна даглядаў расліны і стварыў для іх усе неабходныя ўмовы: падвёў так неабходнае ім зімою святло, стварыў пэўны цеплавы рэжым і высокую вільготнасць, падкормліваў іх. Тут жа знаходзілася лабараторыя па перапрацоўцы вырашчанай на продаж марыхуаны, між іншым, спецыяльных гатункаў. Гамяльчанін здрабняў і фасаваў наркатычны прадукт, прызначаны для распаўсюджвання праз сетку дылераў. У момант затрымання ў «батаніка» канфіскавана, акрамя канопляў, 1 кг 175 г высушанай і здробненай марыхуаны. Напярэдадні ў Гомелі таксама быў затрыманы 40-гадовы гамяльчанін, які збываў 19-гадоваму каля 100 грамаў марыхуаны. У другім выпадку 20-гадовы гамяльчанін захоўваў 150 грамаў таго ж наркатычнага рэчыва з мэтай збыту па месцы жыхарства.

З пачатку года на тэрыторыі Гомельшчыны сіламі падраздзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама праведзены комплекс аператыўных мерапрыемстваў па перакрыцці каналаў пастаўкі марыхуаны. Усяго сёлета выяўлена 92 злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў, у тым ліку 46 — збыт наркатычных сродкаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ТРАГЕДЫЯ ПАЎТАРЫЛАСЯ

19 лютага апоўдні адбылася буйная аўтааварыя ў Бабруйскім раёне паблізу вёскі Савічы. Там сутыкнуліся тры аўтамабілі: дзве легкавыя іншамаркі і грузавік. У выніку два чалавекі загінулі і два атрымалі траўмы. Складаныя ўмовы надвор'я і неасцярожнае манеўраванне — паўтарылася сітуацыя 17 лютага, калі на гэтай жа трасе Мінск — Гомель у Бабруйскім раёне загінулі 2 дарослых і 2 дзяцей. У прэс-цэнтры ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама паведамілі, што вядзецца следства, высвятляюцца падрабязнасці здарэння, высвятляюцца асобы загінулых.

**Алена КАЗЛОВА.**

### РЭКАРДСМЕН

Летась 42-гадовы жыхар Баранавічаў прыцягнуў асаблівую ўвагу аўтаінспектараў. З 3 красавіка па 15 кастрычніка яго 7 разоў затрымлівалі за кіраванне аўтамашынай у п'яным стане. Яго штрафавалі, арыштоўвалі на 25 сутак, пазбаўлялі вадзіцельскага пасведчання, але нічога не дапамагала. І вось суд г. Баранавічы і раёна пакараў аматара язды на падпітку. Мужчыну выпісалі штраф у памеры 24 мільёны 500 тысяч. Кажуць, гэта самы вялікі ў краіне, які накладаваўся на вадзіцеляў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ ЗНОЎ ПАЙШОЎ УВЕРХ

Рубель змяніў кірунак руху і пайшоў уверх. У чацвер сярэднеўзважаны курс долара на адзінай гандлёвай сесіі страціў 33 капейкі, склаўшы 36,09 руб. Еўра да гэтага часу знізіўся амаль на 50 капеек.

### ГРУЗІНСКІЯ МУЗЫКІ ПРАСПЯВАЮЦЬ НА МАСКОЎСКІМ «ЕЎРАБАЧАННІ» ПЕСНЮ ПРА ПУЦІНА?



**На міжнародным конкурсе «Еўрабачанне-2009», які адбудзецца ў маі ў Маскве, прадстаўніком Грузіі будзе група «Стэфане і 3G». Такое рашэнне прыняла грузінская адборачная камісія, праслухаўшы песню калектыву We don't wanna Put in (чуецца «Мы не жадаем Пуціна», каламбур на падставе англійскага словазлучэння put in — «уводзіць»), перадае «Рэха Масквы».**

Кампазіцыя ўяўляе сабой пародыю на ваяўнічых палітыкаў. У прыватнасці, у песні спяваецца: «We Don't Wanna Put In — The negative move — It's killin' the groove», што на слых можна няправільна зразумець і перакласці як: «Мы не жадаем Пуціна — Гэта разбурэнне — Гэта забівае ўвесь кайф». Поўны тэкст песні можна знайсці на сайце Georgia at Eurovision.

### МІНАБАРОНЫ УКРАІНЫ ПАПЯРЭДЗІЛА АБ ХУТКІМ РАЗБУРЭННІ АРМІІ

**Міністэрства абароны Украіны 19 лютага выступіла з афіцыйнай заявай, у якой сказана, што наяўны бюджэт ведамства на 2009 год з'яўляецца «бюджэтам праядання» і «прывядзе да разбурэння Узброеных сілаў», паведамляе ІА «Украінскія навіны».**

У дакуменце Мінабароны папярэджвае аб пагрозе двухразовага скарачэння колькасці воінскіх частак у стане боегатоўнасці, рэзкага падзення ўзроўню спраўнасці высокатэхналагічнага ўзбраення і тэхнікі, поўнага спынення работ па мадэрнізацыі ўзбраення, прафесійнай дэградацыі вайскоўцаў, масавых звальненняў з арміі.

Абароннае ведамства нагадвае, што ў 2009 годзе прасіла для сябе фінансавання на ўзроўні 32,4 мільярда грыўняў (бюджэт развіцця) або хоць бы 17,5 мільярда грыўняў на падтрыманне цяперашняга стану, аднак Вярхоўная Рада выдзеліла толькі 11,65 мільярда, з якіх непасрэдна з бюджэту запланавана выдаткаваць толькі 7,4 мільярда.

### ВАРШАВА СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО ЗША НЕ АДМОВЯЦЦА АД ПРА

**Варшава разлічвае, што новая адміністрацыя ЗША не адмовіцца ад планаў размяшчэння на польскай тэрыторыі элементаў сістэмы ПРА, заявіў у чацвер у інтэрв'ю газеце «Дзённік» міністр абароны Польшчы Багдан Кліх. Раней паведамлялася, што ЗША могуць адмовіцца ад ПРА ў Еўропе.**

«Мы не жадаем прымушаць ЗША рабіць штосьці, але я павінен адкрыта сказаць, што мы спадзяёмся, што абавязкі, якія ўзяла на сябе Амерыка летась у такой пампезнай манеры, будуць рэалізаваныя», — сказаў міністр.

### КІТАЙСКІ ШТУЧНЫ СНЕГАПАД ПАРАЛІЗАВАЎ ЗЛУЧЭННЕ З ПЕКІНАМ



**Моцныя штучныя снегапады, выкліканыя метэаролагамі ў паўночна-ўсходняй кітайскай правінцыі Хэбэй, якая з трох бакоў атачае Пекін, паралізавалі рух на дванаццаці галоўных аўтамагістралях.**

У прыватнасці, была закрытая траса, якая злучае Пекін з Шэньянам (Shenyang) галоўным горадам правінцыі Ляанін (Liaoning). Снегапады былі выкліканыя, каб перамагчы небывалую засуху, якая пагражае знішчыць пасевы. Метэаролагі распылілі над аблокамі 313 зарадаў ёдзістага серабра, што выклікала багатае выпадзенне ападкаў. Чакаецца, што ў шэрагу раёнаў снегапады будуць ісці амаль суткі.

Рэпартаж з колаў

## «Аж з сямнаццатага года, шчасце ў доме, ці бяда, ты прыходзіла к народу, беларуская «Звязда»...

**Чаму падчас чарговай «кругасветкі» стамляюцца нашы вадзіцелі, можна і не пісаць: далёкія пераезды, дажджы альбо завеі, ямы і калдобіны, незнаёмыя гарады, «чайнікі» сярод спадарожных ці сустрэчных кіроўцаў, недахоп паказальнікаў... Праца. У іх. Мы ж, як быццам, проста сядзім у машыне, нават адпачываем, можна сказаць (ад сустрэчы да сустрэчы). А стамляемся ўсё адно.**

**Але гэта, шчыра кажучы, не найгоршае, што даймае потым, пасля прыезду...**

Барысаўскі кінатэатр «Кастрычнік» уразіў найперш сваімі велічэзнымі памерамі, высокім заснежаным дахам і прыступкамі — урачыстасцю (звонку). І ціхай будзённасцю ўнутры: нехта сілкаваўся ў невялічкім бары, нехта некага чакаў. А калі не адзін і з кветкамі...

Мы не памыліліся: наш падпісчык Іван Іванавіч Жэраўчук — з жонкай, дачкой, сынам. Яшчэ і зяць, сказалі, вось-вось прыедзе. Пакуль чакалі — і яго, і пачатку сустрэчы — быў час пазнаёміцца, пагаварыць. Даведацца, прынамсі, што «Звязда» ў гэту ну вельмі прыгожую сямейку прыходзіць амаль 20 гадоў, што да сяброўства з ёй гаспадара падштурхнула... хітрасць:

— Выпісвалі мы іншае выданне, рускамоўнае, — расказваў Іван Іванавіч, — але яно да нас, можна сказаць, не даходзіла: кралі з паштовай скрынкі. Раз, другі, трэці... А мы ў ваенным гарадку жывём. Народ з усяго свету сюды паз'язджаўся. Ага, думаю, ён жа беларускай мовы не ведае, значыць, «Звязду» ў мяне красці не будуць? Выпісаў. Нічога падобнага — усё адно крадуць!..

Іншы чалавек, згадзіцеся, у гэтым выпадку мо адмовіўся б ад падпіскі, ад газеты зусім — Іван Іванавіч — не. Ён іншае выйсце знайшоў — замовіў на пошце скрынку, забіраў газету сам.

Была ў яго і другая падстава, для таго каб ад «Звязды» адмовіцца: як чалавек, можна сказаць, ваенны, спадар Жэраўчук штоквартал афармляў падпіску, штоквартал выразаў з газеты купон, дасылаў яго ў рэдакцыю. І не выйграваў — ніколі і нічога! Нават з драбязы!

Адно, як расказваў — ніколі не сумняваўся, што разыгрываецца ўсё сумленна, чытаў усе паведамленні аб розыгрышах, усе «рэпартажы з колаў», дзе мы пісалі, каму што ўручана. І, напэўна ж, чакаў?




**Халадзільнік «Атлант» — Івану Іванавічу ЖЭРАЎЧУКУ і яго жонцы Ірыне Арэф'еўне, як узнагарода за вернасць мове і газеце.**

— У той вечар, значыць, — успамінаў Іван Іванавіч, — ляжу на канапе, чытаю газету. Само сабой, артыкул, дзе напісана, хто што выйграў. Бачу — маё прозвішча ў канцы. І горад — Барысаў... Жэраўчукі тут, ведаю, толькі мы з сынам — болей няма. І ўсё адно паверыць не магу... Ужо не помню, што я там — войкаў, ці вохкаў, але жонка спужалася і бягом да мяне. Пытаецца: «Што з табой?! Табе дрэнна?!». А я ёй: «Не, мне добра... На во, пачытай»... Арэф'еўна мая, расіянка, беларускую мову не ведае, але пра тое, што мы халадзільнік выйгралі, адразу прасекла.

Вось пра гэта Іван Іванавіч расказваў ужо прылюдна — перад усімі ідэолагамі раёна (у зале больш за 300 чалавек сабралася). Што, зразумела ж, прымусіла пахваляваццa... І нас, бо не сапраўдныя прамоўцы, не настаўнікі, не палітрукі. Ды і прызёр наш усё жыццё працаваў электрыкам у кватэрна-эксплуатацыйнай часці.

Праўда, як высветлілася, незвычайным электрыкам.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.02.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 830,00 |
| ▲ 1 еўра | 3 575,42 |
| 1 латвійскі лат | 5 058,54 |
| 1 літоўскі літ | 1 036,42 |
| 1 чэшская крона | 124,77 |
| 1 польскі злоты | 762,85 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 78,41 |
| 1 украінская грыўня | 339,74 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 36,0910 |
| 10 UAH | 43,3265 |
| 1000 BYR | 12,7937 |
| EUR | 45,4422 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

# Парадак правядзення і кантролю знешнегандлёвых аперацый у Беларусі спрашчаецца з 1 красавіка

**У Беларусі ў мэтах дэбюракратызацыі знешнеэканамічнай дзейнасці з 1 красавіка спрашчаецца парадак правядзення і кантролю знешнегандлёвых аперацый. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 19 лютага падпісаў указ № 104, якім унесены змяненні і дапаўненні ва ўказ № 178 ад 27 сакавіка 2008 года.**

Дакумент накіраваны на далейшую лібералізацыю эканамічных умоў і інвестыцыйнага клімату ў Беларусі.

Існуючы дастаткова фармалізаваны механізм афармлення пашпарта здзелкі заменены працэдурай рэгістрацыі здзелкі ў банку па заяўным прынцыпе. Рэгістрацыя будзе ажыццяўляцца ў дзень прадстаўлення дакумента, пры дапамозе якога афармлены знешнегандлёвы дагавор.

Выключана неабходнасць узгаднення праводзімых знешнегандлёвых здзелак (адносна піваварнага ячменю і непадрыхтаванага соладу з ячменю) з канцэрнам «Белдзяржхарчпрам», а таксама атрымання адбітка штампа ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа» на знешнегандлёвых дагаворах, заключаных на біржавых таргах.

Рэзідэнтам, якія ажыццяўляюць знешнегандлёвыя аперацыі, прадастаўлена права не рэгістраваць здзелкі пры папярэдняй аплаце ў поўным аб'ёме (пры экспарце) або папярэднім паступленні тавараў у поўным аб'ёме (пры імпарце); а таксама праводзіць з дазволу Нацыянальнага банка разлікі па знешнегандлёвых дагаворах, якія прадугледжваюць імпарт тавараў без іх паступлення на мытную тэрыторыю рэспублікі.

Рэзідэнты, якія ажыццяўляюць знешнегандлёвыя аперацыі, могуць таксама спыняць абавязацельствы шляхам залічэння дагавора фактарынгу або з выкарыстаннем неграшовых формаў; ажыццяўляць перамену асобаў у абавязацельстве з перарэгістрацыяй здзелкі; самастойна вызначаць звесткі, што называюцца ў дакументах, пры дапамозе якіх афармлены знешнегандлёвыя дагаворы (за выключэннем умоў разліку, якія ў абавязковым парадку павінны быць прадугледжаны ў такіх дакументах).

Дадаткова да вызначаных на гэты час выпадкаў з-пад дзеяння валютнага кантролю выведзены знешнегандлёвыя аперацыі:

звязаныя з перадачай маёмасці ў арэнду, фінансавую арэнду (лізінг) незалежна ад таго, з'яўляецца арандатарам або арэндадаўцам рэзідэнт або нерэзідэнт, а таксама ад месца знаходжання маёмасці, якая перададзена ў арэнду, фінансавую арэнду (лізінг);

праводзімыя паміж рэзідэнтамі і нерэзідэнтамі ў рамках выканання адміністрацыйных працэдур;

па дагаворах страхавання (усіх відаў), дагаворах пазыкі і крэдытных дагаворах;

пры правядзенні якіх фактычнымі атрымальнікамі ахоўнай інфармацыі, выключных правоў на выніку інтэлектуальнай дзейнасці, паслуг выступаюць фізічныя асобы — рэзідэнты або нерэзідэнты;

адносімыя да банкаўскіх аперацый;

праводзімыя рэзідэнтамі на тэрыторыі Беларусі з прадстаўніцтвамі (філіяламі) нерэзідэнтаў, дыпламатычнымі і іншымі афіцыйнымі прадстаўніцтвамі (філіяламі), консульскімі ўстановамі замежных дзяржаў, якія знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, для ўласных патрэбаў з мэтай забеспячэння функцыянавання гэтых прадстаўніцтваў (філіялаў), консульскіх устаноў, а таксама з фізічнымі асобамі — нерэзідэнтамі па рэалізацыі тавараў (ахоўнай інфармацыі, выключных правоў на выніку інтэлектуальнай дзейнасці, работ і паслуг) для выкарыстання, не звязанага з прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Пашыраны магчымасці правядзення рэзідэнтамі разлікаў па знешнегандлёвых аперацыях.

Акрамя таго, да 1 мая 2009 года Савет Міністраў павінен вызначыць новы комплексны парадак прадстаўлення рэзідэнтамі статыстычных дэкларацый (перыядычных статыстычных дэкларацый) пры выкананні знешнегандлёвых дагавораў, калі мытнае афармленне тавараў не праводзіцца, з вызначэннем працэдуры і выпадкаў падачы такіх дэкларацый.

Новыя правілы правядзення і кантролю знешнегандлёвых аперацый уступяць у сілу з 1 красавіка 2009 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «Аж з сямнаццатага года...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Усе, каму я расказваю пра свайго бацьку, — з гонарам, з любоўю гаварыла потым дачка (і шкада, што не ўсім. — **Аўт.**), — не стамляюцца ім захапляцца. Мой тата ўсё жыццё нечым цікавіцца. Ён вельмі многа ведае, вельмі многае ўмее. Пры адпаведнай адукацыі ён, магчыма, стаў бы знакамітым кінарэжысёрам — захапляецца фатаграфіяй, дзякуючы гэтаму, «піша» гісторыю нашай сям'і... А пасля выхаду на пенсію ён і наогул купіў сабе камп'ютар, цэлы стос кніг. Асвоіў — сам, з нуля, без ніякіх курсаў. І цяпер да тых старых, да новых фотаздымкаў дадаецца музыка і атрымліваецца сапраўднае дакументальнае кіно — пра ўнучак, пра доўгачаканага ўнука Данілку...

— А яшчэ, — працягвала Тацяна, — мы з Дзімам (гэта брат. — **Аўт.**) за ўсё сваё жыццё ні разу не бачылі бацьку п'яным. Не таму, што яму там нешта баліць ці ён не можа выпіць. Проста яму гэта нецікава. Часу не трэба, не цікава... У яго іншыя захапленні, іншыя мэты.

Адна з іх, відаць, агульная для ўсіх бацькоў — быць патрэбным сваім дзецям, дапамагаць ім (хоць у гэтай сям'і — дзякуй Богу і выхаванню — яны і самі не зломкі). Прынамсі, Іван Іванавіч і Ірына Арэф'еўна, нягледзячы на пенсійны ўзрост, па-ранейшаму працуюць: ён у блізкай ад дома школе («галоўным па гаспадарчай частцы»), яна — у Палацы піянераў (касцюмерам). У кватэру дачкі (сын, сказалі, не ў крыўдзе) пераехаў і звяздоўскі халадзільнік — там патрэбней. Што ж — наша справа ўручыць прыз, а каму ён будзе служыць — воля ўладальнікаў.

Адзінае, чаго трохі шкада было — у сем'ях Жэраўчукоў малодшых надта ці прыжывецца «Звязда». Чаму?

— У нас тут, — расказваў Іван Іванавіч, — быў закрыты ваенны гарадок і была ўстанова: дзеці вайскоўцаў мову не вучаць. Яно і зразумела, як быццам: бацькі іх сёння тут, у Барысаве, заўтра ў Казахстане ці недзе яшчэ — сэнсу няма. А ў выніку — у класе 28—30 чалавек, і з іх толькі 5-6 — мясцовыя, тутэйшыя. Вось мы і ідзём у школу на дзве гадзіны раней, вучым беларускую, у тым ліку, і паспаць могуць, і пагуляць, і ўрокаў ці «лішніх» рабіць не трэба. Карацей — мы, малыя, беларускую мову, літаратуру, мякка кажучы, не любілі. Прайшоў час. У тую ж школу, з той самай «устаноўкай» пайшлі мае дзеці. Але мову ўжо не вучылі, таму, што вайскоўцам быў я.

Але ж, мусіць, і сапраўды: тое, што ты ведаў у дзяцінстве, — ведаеш заўсёды: мала таго, што наш падпісчык ніколечкі не спасаваў перад шматлюднай аўдыторыяй (з спінай да таго ж і прэзідыум быў) — ён яшчэ і гаварыў проста, шчыра, з гумарам, па-беларуску! Зала (ну не прывыкшыя яны да першай дзяржаўнай мовы) слухала — можна сказаць, нават затоена, раз-пораз выбухаючы дружным смехам і апладысментамі.

Карацей — за вельмі невялікі прамежак часу, мы, разам з шаноўным падпісчыкам і дзякуючы найперш яму, змаглі вельмі шмат чаго расказаць пра газету, яе гісторыю, яе змест, перавагі перад іншымі... І, спадзяёмся, знайсці сабе новых сяброў-прыхільнікаў.

Пра што вельмі прыемна было расказаць начальніку Барысаўскага вузла паштовай сувязі Васілю Афрысанавічу Казачку і яго намесніцы Людміле Васільеўне Кавалёнак.

Разам з імі, дарэчы, мы павывучалі крыху статыстыку: у Слуцкім раёне ў «Звязды», у роднай газеты на роднай мове, 842 падпісчыкі, у Клецкім і Салігорскім — па 745, у Стаўбцоўскім 695, у Валожынскім — 642... А ў Барысаўскім — 488. Нават не 500! Крыўдная лічба. Яе многім можна тлумачыць — у тым ліку і многанацыянальнасцю, «вайсковасцю». Але ж ад гэтага не лягчэй. Значыць, трэба працаваць тут і нам, і паштавікам, і тым самым ідэолагам. Паасобку і разам.

Папярэдняя дамоўленасці на гэта ёсць.

**Валянціна ДОЎНАР, Уладзімір ЗДАНОВІЧ (фота).**

*(Заканчэнне будзе.)*

*Мінск — Смалявічы — Жодзіна — Барысаў — Крупкі — Талачын — Віцебск — Полацк — Шуміліна — Наваполацк — Глыбокае — Докшыцы — Мінск.*



**Гадзіннік з лагатыпам газеты — дзелавым партнёрам «Звязды»: кіраўніку Барысаўскага РВПС Васілю Афрысанавічу КАЗАЧКУ і яго намесніцы Людміле Васільеўне КАВАЛЁНАК, а таксама намесніку старшыні Смалявіцкага райвыканкама Аляксандру Віктаравічу ШЛЫКАВУ.**

# ЧАТЫРЫ ЗАЛАТЫЯ

**Удзельнікі з пятнаццаці краін свету з'ехаліся ў Мінск на XIII Адкрыты чэмпіянат Беларусі па самба на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які 17 лютага прайшоў у Палацы спорту. Ужо другі год турнір носіць статус аднаго з чатырох этапаў Кубка свету, што сведчыць пра яго высокі міжнародны ўзровень.**



Фота БЕЛТА.

Усяго ж уладальнікамі залатых медалёў сталі прадстаўнікі трох краін: Аляксандр Курлыпа (вагавая катэгорыя да 52 кг), Руслан Намазаў (68 кг), Сцяпан Папоў (74 кг), Магамед Абдулганіеў (82 кг) (усе — Беларусь), Алім Зікаеў (57 кг) (Таджыкістан), Раман Хлопаў (62 кг), Павел Румянцаў (90 кг), Яўген Ісаеў (100 кг), Віталь Мінакоў (звыш 100 кг) (усе Расія). Хоць Расія і перасягнула нас па колькасці медалёў (на рахунку нашых суседзяў 16 узнагарод), па іх якасці Беларусь на першым месцы — 4 залатыя, 5 сярэбраных і 8 бронзавых.

З 2007 года Прэзідэнцкім спартыўным клубам акрамя асноўных узнагарод заснаваны два спецыяльныя прызы: «За волю да перамогі» і «За лепшую тэхніку». Сёлета іх уладальнікамі сталі 19-гадовы беларускі самбіст Руслан Намазаў, які выйграў «золата» ў катэгорыі да 68 кг («За волю да перамогі») і расіянін Раман Хлопаў, пераможца ў катэгорыі да 62 кг («За лепшую тэхніку»). Акрамя беларусаў і расіян узнагароды Адкрытага чэмпіянату Беларусі па самба заваявалі прадстаўнікі Таджыкістана(1 залаты), Казахстана (2 бронзавыя), Латвіі, Украіны, Румыніі і Германіі (па 1 бронзавым).

Арганізатарамі турніру выступілі Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны алімпійскі камітэт, Мінгарвыканкам, Беларуская федэрацыя самба і БФСА «Дынама».

**Алена КРАВЕЦ.**

# УТАПІЎСЯ Ў КАНАВЕ

У вёсцы Хатомель Столінскага раёна ўтапіўся ветэран вайны.

Гэта здарылася пры пераходзе праз канаву па кладцы, якую зрабіў сельсавет. Пенсіянер паслізнуўся і ўпаў у ваду. Састарэлы інвалід выбрацца з канавы не здолеў. Каб зрабіць на канаве больш-менш трывалы мост і падыход да яго, патрэбны вялікія ў мясцовым маштабе грошы, а іх у сельсавета няма.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Абзац

■ Сёння ў Беларусі ўступае ў сілу расшыраны пералік платных медыцынскіх паслуг, якія будуць аказваць дзяржаўныя лячэбныя ўстановы. Напрыклад, платнымі стануць некаторыя прафілактычныя і дыягнастычныя агляды, а таксама лячэнне храпу.

■ **ААТ «Віцебскі маторарамонтны завод» сумесна з фінскай фірмай Kivil-Pekka засвоіла вытворчасць падборшчыкаў камянёў. Магчымасці агрэгата дазваляюць збіраць камяні дыяметрам ад 30 мм да 300 мм і адначасова рыхліць глебу на глыбіню 15 см. Кошт аднаго падборшчыка складае Br135 млн. Сёлета прадпрыемства плануе выпусціць 60 такіх машын.**

■ Жыхар Жодзіна, паведамілі БЕЛТА ў пракуратуры Смалявіцкага раёна, зарабіў на пірацкім відэа каля Br60 млн. Ён падазраецца ў тым, што незаконна распаўсюджваў аудыёвізуальную прадукцыю, якую закупляў у Расіі. Зараз пракуратура высвятляе наяўнасць у падазронага маёмасці і банкаўскіх рахункаў, каб была магчымасць кампенсаваць урон праваўладальнікам.

■ **Кампанію Philip Morris абавязалі выплаціць амерыканцы, чый муж памёр у 1997 годзе ад раку лёгкіх, 8 млн. долараў. Такое рашэнне 18 лютага прыняў суд штата Флорыда. Раней жанчына ўдзельнічала ў калектыўным іску, але суд пастанавіў, што пацярпелыя ад курэння могуць падаваць толькі індывідуальныя іскі. Чакаецца, што ў найбліжэйшы час суд разгледзіць яшчэ некалькі такіх жа спраў.**

## Поўны абзац

■ У расійскім Абакане (Хакасія) міліцыянеры, пажарныя, сапёры, медыкі і кінолагі больш за гадзіну праводзілі спецаперацыю з-за падазронай пасылкі, у якой у выніку быў знойдзены... вібратар. Супрацоўнікі аднаго з паштовых аддзяленняў звярнулі ўвагу на пасылку, якая ў той момант, калі да яе дакраналіся, пачынала вібраваць і біцца токам. Паштавікі вырашылі, што ў пакунку бомба, і выклікалі міліцыю. На пошту прыбылі сілавікі і выратавальнікі. Людзі, што знаходзіліся ў паштовым аддзяленні і побач з ім, былі эвакуяваныя. Калі праз гадзіну дзеянняў пакет ускрылі, у ім знайшлі вібратар. Ён быў дасланы з Падмаскоўя для адной мясцовай жыхаркі, якая забрала пасылку адразу ж пасля таго, як пошту пакінулі супрацоўнікі экстраных службаў. Як паведамілі спецыялісты, пярэпалаху можна было пазбегнуць, калі б інтымны электрапрыбор перасылаўся па правілах — варта было дастаць батарэйкі.



■ **Свой уласны рэкорд палепшыў бакалейшчык з Індыі Радхакант Байджпай, які быў у свой час унесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса як уладальнік самых доўгіх валасоў у вушах. У 2003 годзе даўжыня валасоў складала 13,2 см, а зараз — ужо 25 см. Сам рэкардсмен расказвае, што ён пастаянна даглядае сваю расліннасць, а гэта адбіваецца на выніку.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Павел КАЛАУР: «Навацыі ў знешнеэканамічнай дзейнасці прадоўжаць лінію па эканамічнай лібералізацыі...»

**Удзельнікі знешнеэканамічнай дзейнасці станоўча ўспрымуць усе навацыі, што знайшлі адлюстраванне ва ўказе кіраўніка дзяржавы па лібералізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці, лічыць першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел Калаур. У сваю чаргу галоўны банк краіны, на які ўскладзены кантроль за гэтай дзейнасцю, будзе не толькі праводзіць маніторынг сітуацыі, але і ўдасканальваць працэдуры і падыходы з тым, каб гэта прыносіла максімальны эфект суб'ектам гаспадарання і мінімізавала расходы дзяржавы.**

Як вядома, апошнім часам у краіне праводзіцца вельмі актыўная палітыка, што накіравана на лібералізацыю эканамічнай дзейнасці. Гаворачы аб чарговым кроку ў гэтым напрамку, банкаўскі спецыяліст падкрэсліў наступнае: «Кіраўніком дзяржавы прынятае рашэнне аб лібералізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці, што павінна прадоўжыць агульную лінію па эканамічнай лібералізацыі і даць магчымасць нашым суб'ектам гаспадарання працаваць у новых, істотна лепшых умовах».

У прыватнасці, зазначае Павел Калаур, цяпер рэзідэнт будзе рэгістраваць здзелкі па заяўным прынцыпе ў банку, які яго абслугоўвае, без марнавання часу на афармленне розных дакументаў і без страты часу на праверку банкам знешнегандлёвага дагавора. Да таго ж, гэтыя здзелкі можна ажыццяўляць у электронным выглядзе. А ўлічваючы тое, што ў банкаўскай дзейнасці і ва ўзаемаадносінах з кліентамі шырока распаўсюджаны электронны дакументаабарот, дзейнічае сістэма банк-кліент, гэта значна спрашчае ўзаемаадносіны кліента і банка. Такім чынам, патлумачыў Павел Калаур, зарэгістраваць гандлёвую здзелку можна будзе без усялякай цяганіны.

У новым указе рэзідэнту таксама даюцца больш шырокія паўнамоцтвы ў адносінах да выканання сваіх абавязацельстваў па знешнегандлёвым кантракце. Так, да прыкладу, суб'ект знешнегандлёвых адносінаў будзе мець права ажыццяўляць перамену асобаў у абавязацельствах у адносінах іншых рэзідэнтаў, дазволена залічэнне грашовых сродкаў ад экспарту на рахункі па фактарынгу і іншыя аперацыі.

Вельмі важным назваў Павел Калаур і тое, што знешнегандлёвыя аперацыі могуць быць працягнутыя ў адным пункце. Дарэчы, ужо ў папярэднім дакуменце, які выйшаў у сакавіку мінулага года, была зроблена спроба рэалізацыі прынцыпу «аднаго акна» і падаўжэння тэрмінаў паступлення выручкі ці тавару пры ажыццяўленні экспартна-імпартных аперацый, што можна было зрабіць у Нацыянальным банку і яго рэгіянальных структурных падраздзяленнях. Зараз геаграфічная даступнасць суб'ектаў гаспадарання да інстытута, які працягвае дазвол, пашырылася, што, зразумела, эканоміць іх час і грошы.

Улічваючы, што ўся база звестак па суб'ектах знешнегандлёвых аперацый будзе сканцэнтравана ў Нацыя-нальным банку — гэта і грашовыя патокі, і таварныя патокі — цяпер пры прыняцці рашэнняў аб прадаўжэнні тэрмінаў можна будзе карыстацца ўжо назапашанай інфармацыяй. Па сутнасці, заўважыў Павел Калаур, фарміруецца гісторыя аб добрасумленных і нядобрасумленных удзельніках знешнеэканамічнай дзейнасці. Гэта дазволіць яшчэ больш скараціць бюракратычныя працэдуры пры разглядзе зваротаў суб'ектаў гаспадарання. Акрамя таго, у новым дакуменце прадугледжана права даваць тлумачэнні па дзейных нормах галоўнаму банку. Не сакрэт, калі да трактавання заканадаўчага акта прыцягваецца шэраг устаноў, як правіла, пры неадназначнасці трактовак з'яўляюцца розныя меркаванні і, натуральна, гэта выклікае непатрэбную бюракратычную цяганіну пры атрыманні тлумачэння суб'ектам гаспадарання. Зараз, калі гэтае права даецца Нацбанку, там мяркуюць ім скарыстацца разумна, каб назапашваць практыку і праблемныя пытанні, якія будуць узнікаць у суб'ектаў гаспадарання, і далей ініцыяваць удасканаленне заканадаўства ў гэтай сферы.

Разважаючы над тым, ці нельга поўнасцю адмовіцца ад кантролю знешнеэканамічных аперацый, Павел Калаур заўважыў, што для дзяржаў з пераходнай эканомікай ажыццяўленне знешнеэканамічнага кантролю над патокамі тавараў і вяртаннем валютнай выручкі — жыццёва неабходны этап. Таму што, як правіла, краіны, якія развіваюцца, маюць праблемы са знешнеэканамічнай пазіцыяй, гэта значыць праблемы з плацежным балансам краіны, калі толькі яна, напрыклад, не з'яўляецца экспарцёрам нафты і газу. І таму асаблівае значэнне мае якраз правільнае, руплівае выкарыстанне ўсіх сродкаў дзяржавы, у тым ліку і валютных. Грошы, як падкрэсліў Павел Калаур, павінны працаваць. Калі ў аднаго суб'екта гаспадарання ёсць часова свабодныя грошы і гэта замежная валюта, а другі ў апошняй мае патрэбу, то неабходна арганізаваць такім чынам знешнегандлёвую дзейнасць, каб была магчымасць гэтыя сродкі задзейнічаць для развіцця сваёй эканомікі, каб яны не ляжалі мёртвым грузам на рахунках у замежных банках. Разам з тым, банкір выказаў упэўненасць у тым, што практыка ажыццяўлення, з аднаго боку, кантролю знешнеэканамічных аперацый ва ўмовах развіцця эканомікі, а з другога — зніжэння бюракратычных працэдур і лібералізацыі гэтага працэсу будзе працягнутая. «Прыйдуць тыя часы, калі мы зможам канстатаваць, што з пункту гледжання знешнеэканамічнага кантролю краіна падышла да поўнай лібералізацыі, калі суб'екты гаспадарання, зыходзячы са сваіх эканамічных інтарэсаў, з рынкавай дысцыпліны, будуць самастойна рэгуляваць гэтыя працэсы», — выказаў меркаванне Павел Калаур.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# ПРЫСТОЙНАЯ ПРАПАНОВА

**Вынікам візіту дэлегацыі ПАСЕ ў Беларусь, магчыма, стане ініцыятыва па аднаўленні для беларускага парламента статусу спецыяльнага запрошанага.**

Дэлегацыя Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы завяршыла свой візіт у Беларусь. Госці сустрэліся з кіраўніцтвам парламента, пэўных міністэрстваў і ведамстваў, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці. Тон, зададзены ў перамовах, дапускае пэўны аптымізм.

— 12 гадоў ізаляцыі не прывялі ні да чаго добрага, таму мы зараз стараемся аднавіць спецыяльны статус Беларусі ў Парламенцкай Асамблеі, — адзначыў **Ёран ЛІНДБЛАД, старшыня Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ,** падчас сустрэчы з журналістамі. — Нам паступаюць сігналы аб зменах у лепшы бок у Беларусі. І спадар Рыгоні (Андрэа Рыгоні, дакладчык па Беларусі Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ — **Аўт.**) прапануе хутчэй за ўсё аднавіць статус Беларусі. Спачатку гэта пытанне будзе абмяркоўвацца ў камісіі па палітычных пытаннях, а потым будзе вынесена на абмеркаванне ПАСЕ.

Абмеркавання можна чакаць падчас сесіі Асамблеі ў чэрвені. «Мы будзем настойваць на тым, каб у дэлегацыі Беларусі ў ПАСЕ таксама былі члены апазіцыі. Як гэта можна зрабіць — хутчэй пытанне тэхнічнага характару», — падкрэсліў спадар Ліндблад. Ён таксама выказаў спадзяванне, што «будзе праяўлена пэўная гнуткасць». Старшыня Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ заявіў: «У нас няма нейкіх асаблівых крытэрыяў, умоў для аднаўлення статусу спецыяльнага запрошанага, аднак гэта будзе ўзгоднена ў далейшым». Ён таксама дадаў, што «важны сам дыялог», і зрабіў акцэнт на тым, што паралельна Еўрасаюз вядзе дыялог аб адкрыцці краіны. «Думаю, мы зможам разам працаваць над адкрыццём Беларусі для ўсяго свету», — заўважыў Ёран Ліндблад. — «Час вярнуць Беларусь у сям'ю еўрапейскіх народаў». Ён таксама зрабіў акцэнт на тым, што, «магчыма, фінансавы крызіс дапаможа нам у гэтым, я лічу, што зараз Расія ў адзіночку не зможа дапамагчы Беларусі фінансава, Беларусі будзе патрэбна і дапамога еўрапейскай супольнасці».

«Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе ёсць смяротнае пакаранне», — падкрэсліў старшыня Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ. Пры гэтым ён запэўніў, што адмена такой меры пакарання не з'яўляецца «крытэрыем для атрымання спецыяльнага статусу» Беларуссю. Аднак «неабходна адзначыць правільны кірунак, у якім ідзе Беларусь на шляху да адмены смяротнага пакарання». Абмяркоўваліся, безумоўна, пытанні ўдзелу апазіцыі ў беларускай дэлегацыі ў ПАСЕ, свабоды СМІ. «Зараз з Беларусі паступаюць сігналы, што краіна ідзе ў правільным кірунку, на шляху да дэмакратызацыі», — канстатаваў Ёран Ліндблад.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# ЗЛОДЗЕЙ — ДРЭННЫ «ПАРТНЁР»

У пенсіянера з вёскі Індычы Камянецкага раёна зламыснікі ўкралі бензапілу «Партнёр». Міліцыя хутка затрымала зладзеяў, імі былі жыхары вёскі Пелішча гэтага ж раёна 1985 і 1988 гадоў нараджэння.

**Яна СВЕТАВА.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания прирельсового склада (общ. пл. 424,3 кв.м), расположенного: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Нач. цена снижена на 20 % — 82 567 100 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.09.2007 г. Аукцион состоится **25.03.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.03.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Борисовском райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, в том числе: **ЛОТ № 1** – центральный склад (общ. пл.1088,4 кв.м), расположенный по адресу: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Начальная цена 261 235 000 бел. руб.; **ЛОТ № 2** – складское помещение (общ. пл. 374,6 кв.м), расположенное по адресу: Борисовский р-н, д. Лошница. Начальная цена 48 007 000 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объекты осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **25.03.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.03.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

Задорьевский сельский исполнительный комитет Логойского района (продавец)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельного участка для индивидуального жилищного строительства в д. Васильковка. Площадь участка 0,2500 га.**

Начальная цена — 7 500 000 рублей. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.01.2009 г. Аукцион состоится **2 марта 2009 года** в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Задорье, ул. Центральная, 5. Заявления на участие и необходимая документация принимаются по **27 февраля 2009 года** до 17.00 по указанному адресу.

УНП 600181628

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **ЛОТа № 1** – цеха лесопильного (общ. пл. 548,7 кв.м) по адресу: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Начальная цена снижена и составляет – 71 102 610 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2008 г. Аукцион состоится **25.03.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.03.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства гаража № 60 (пл. 25 кв.м) с подвалом (пл. 10 кв.м) в ГК «Днепровец» в г. Борисове. Начальная цена снижена на 10 % — 8 321 940 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.07.2008 г. Аукцион состоится **25.03.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.03.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

Наблюдательный совет ОАО МК № 93

ставит в известность, что 27.03.09 г. в 10.00 в помещении ОАО Мехколонна № 93 (3 этаж) по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13 состоится отчетно-выборное собрание акционеров по результатам работы за 2008 год.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет о работе Наблюдательного совета ОАО МК-93 за 2008 год.
*Докладчик — Председатель Наблюдательного совета Михальков Н.Я.*
2. Отчет дирекции о производственно-финансовой деятельности по использованию сметы ФЭС за 2008 год и утверждение плана социально-экономического развития и сметы ФЭС общества Мехколонна № 93 по направлению на 2009 год.
*Докладчик — директор ОАО МК-93 Сосновский В.М.*
3. Отчет Ревизионной комиссии ОАО о работе за 2008 год и утверждение акта аудиторской проверки финансовой деятельности ОАО Мехколонна № 93 за 2008 год.
*Докладчик — Афанасьев А.П.*
4. Утверждение годового баланса ОАО МК-93 за 2008 год.
*Докладчик — Гл. бухгалтер ОАО МК-93.*
5. Определение порядка выплаты дивидендов на 2009 г.
*Докладчик — Сосновскй В.М.*
6. Изменение и дополнение Устава ОАО МК-93.
*Докладчик — Михальков Н.Я.*
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии по ОАО Мехколонна № 93.
*Докладчик — Сосновский В.М.*
8. Определение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
*Докладчик — Сосновский В.М.*

**Председатель Наблюдательного совета ОАО МК-93 — Н.Я. Михальков**

УНП 100003019

ОАО «Белхимэнерго»

уведомляет акционеров о проведении очередного годового Общего собрания акционеров Общества 26 марта 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пер. Асаналиева, 3.

Повестка дня собрания:

1. Избрание председателя Общего собрания акционеров.
2. Утверждение отчета Ревизионной комиссии Общества о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторской организации.
4. Распределение прибыли и убытков Общества за 2008 год.
5. Объявление размеров дивидендов и определение срока их выплаты.
6. Избрание Наблюдательного совета Общества.
7. Избрание Ревизионной комиссии Общества.

Регистрация участников осуществляется с 10.00 до 11.00 при предъявлении акционером документа, удостоверяющего личность, представителем акционера — доверенности на представление интересов и документа, удостоверяющего личность.

С материалами собрания можно ознакомиться после 13 марта 2009 года по адресу: г. Минск, пер. Асаналиева, 3.

УНП 100363932

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 3 марта 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний.**

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день подачи заявлений – **26.02.2009 года** до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **03.03.2009 года** с 14.30 до 15.50 в каб. 206.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787;

б) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность стоимость объекта аукциона (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты, связанные с подготовкой аукциона и документацией, необходимой для его проведения. Сумма расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, будет сообщена дополнительно.

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пер.1-й Ровчакова, 1 | 0,0921 га | 740100000001004766 | 10 762 000 | 969 000 |
| 2 | пер.1-й Ровчакова, 5 | 0,0938 га | 740100000001004768 | 10 961 000 | 986 000 |
| 3 | пер.1-й Ровчакова, 7 | 0,0942 га | 740100000001004769 | 11 008 000 | 991 000 |
| 4 | пер.1-й Ровчакова, 9 | 0,0946 га | 740100000001004770 | 11 055 000 | 995 000 |
| 5 | пер.1-й Ровчакова, 11 | 0,0973 га | 740100000001004771 | 11 370 000 | 1 023 000 |
| 6 | пер.2-й Ровчакова, 1 | 0,0975 га | 740100000001004772 | 11 393 000 | 1 025 000 |
| 7 | пер.2-й Ровчакова, 2 | 0,0990 га | 740100000001004774 | 11 569 000 | 1 041 000 |
| 8 | пер.2-й Ровчакова, 3 | 0,0990 га | 740100000001004775 | 11 569 000 | 1 041 000 |
| 9 | пер.2-й Ровчакова, 4 | 0,0986 га | 740100000001004776 | 11 522 000 | 1 037 000 |
| 10 | пер.2-й Ровчакова, 5 | 0,0995 га | 740100000001004777 | 11 627 000 | 1 046 000 |
| 11 | пер.2-й Ровчакова, 7 | 0,0999 га | 740100000001004779 | 11 674 000 | 1 051 000 |
| 12 | пер.2-й Ровчакова, 10 | 0,1074 га | 740100000001004781 | 12 550 000 | 1 130 000 |
| 13 | пер.3-й Ровчакова, 2 | 0,0925 га | 740100000001004782 | 10 809 000 | 973 000 |
| 14 | пер.3-й Ровчакова, 4 | 0,0998 га | 740100000001004783 | 11 662 000 | 1 050 000 |
| 15 | пер.3-й Ровчакова, 6 | 0,0972 га | 740100000001004784 | 11 358 000 | 1 022 000 |
| 16 | пер.1-й Сараканайский, 1 | 0,1125 га | 740100000001004762 | 13 146 000 | 1 183 000 |
| 17 | пер.1-й Сараканайский, 5 | 0,1055 га | 740100000001004764 | 15 062 000 | 1 356 000 |
| 18 | пер.1-й Сараканайский, 7 | 0,0932 га | 740100000001004765 | 14 166 000 | 1 275 000 |

Земельные участки расположены на городской улице без асфальтового покрытия. Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет. В радиусе 500 м имеются сети водопровода и газопровода.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63**

УНП 700278209

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

20 ЛЮТАГА 2009 г. ПЯТНІЦА № 7 (15561)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# ЧАМУ МОЛАДЗЬ НЕ ІМКНЕЦЦА ЗВЯЗВАЦЬ СВАЮ БУДУЧЫНЮ З НАВУКАЙ І ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛАЙ?

**Прававы статус, сацыяльнае становішча маладых выкладчыкаў і навукоўцаў, аспірантаў і дактарантаў, эфектыўнасць выкарыстання сродкаў стыпендыяльнага фонду на вызначэнне надбавак і аказанне матэрыяльнай дапамогі, пытанні медыцынскага абслугоўвання, аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння аспірантаў і дактарантаў, дазвол на сацыяльныя водпускі, пытанні эфектыўнасці працаўладкавання — вось далёка не поўны пералік пытанняў і праблем, якія ўзнімаліся падчас «круглага стала», які прайшоў у Цэнтральным камітэце Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. У дыскусію ўключыліся прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Беларускага прафесійнага саюза работнікаў Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя, прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу, загадчыкі аддзелаў аспірантуры вышэйшых навучальных установаў, ну і, зразумела, непасрэдна аспіранты, дактаранты і магістранты.**

***Паводле слоў начальніка ўпраўлення навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі Васілія САФОНАВА***, у апошнія гады прыкладна трэць студэнтаў, а гэта прыблізна 60 тысяч чалавек, актыўна ўдзельнічаюць у студэнцкіх навукова-даследчых работах. Штогод у Беларусі праводзіцца рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ. На базе ВНУ працуюць паўсотні навукова-даследчых студэнцкіх лабараторый. Пастаянна абнаўляецца выстава навукова-тэхнічных распрацовак студэнтаў — цяпер там дэманструюцца каля 250 студэнцкіх работ.

— Разам з тым нас не можа не хваляваць той факт, што год ад году колькасць маладых людзей, якія хочуць звязаць сваё жыццё з вышэйшай школай і навуковай дзейнасцю, змяншаецца, — канстатаваў Васіль Сафонаў. — Адпаведна не выконваюцца і планы па прыёме ў аспірантуру: за апошнія некалькі гадоў недабор вагаўся ў межах 20-25 адсоткаў ад выдзеленых месцаў. Зразумела, узнікае заканамернае пытанне, з чым звязана такая тэндэнцыя? Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 450 «Аб устанаўленні даплат да вучоныя ступені і званні» стварае добры матэрыяльны стымул для таго, каб малады чалавек заканчваў аспірантуру, як мага хутчэй абараняўся, атрымліваў вучоную ступень, званне і гарантаваныя даплаты. Згодна з прэзідэнцкім указам, кандыдаты навук атрымліваюць даплату ў памеры чатырох тарыфных ставак першага разраду, дацэнты — у памеры двух, а доктары навук — шэсць тарыфных ставак. Стыпендыя ж аспіранта складае цяпер 567 тысяч рублёў, а прэзідэнцкая стыпендыя для аспірантаў дасягае 875 тысяч рублёў.

Была агучана яшчэ адна праблема — высокая цякучасць аспірантаў і дактарантаў, не звязаных кантрактнай формай навучання. У некаторых ВНУ яна дасягае 70-80 працэнтаў.

— Высокая аспіранцкая стыпендыя і сапраўды з'яўляецца добрым стымулам для таго, каб выпускнікі ВНУ паступалі ў аспірантуру. Аднак прыцягальным фактарам яна можа быць толькі ў першы год іх навучання, — падзялілася сваім меркаваннем з удзельнікамі «круглага стала» **старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў Нацыянальнай акадэміі навук Наталля АЛЯКСАНДРАВА**. — А як толькі яны даведваюцца пра свае перспектывы пасля яе заканчэння, то на другім ці трэцім курсе пачынаюць шукаць «пралазы», каб быць адлічанымі.

На жаль, але памер заробтнай платы маладых выкладчыкаў і навукоўцаў не дазваляе назваць нашы ВНУ і навуковыя арганізацыі прыцягальным варыянтам працаўладкавання для таленавітай моладзі. Да таго ж ён значна ніжэйшы нават за аспіранцкую стыпендыю (у 1,5-2 разы). А многім жа выпускнікам даводзіцца ўтрымліваць свае сям'і... Варта дадаць, што на выпускнікоў аспірантуры і дактарантуры не распаўсюджваюцца прэферэнцыі, вызначаныя для маладых спецыялістаў. На сёння выпускнік аспірантуры атрымлівае толькі пасведчанне аб здачы кандыдацкіх экзаменаў. А затым яго веды нярэдка «сплываюць у пясок», таму што замест працягу навуковай работы і падрыхтоўкі дысертацыі, ён вымушаны працаўладкоўвацца там, дзе яму будуць плаціць больш-менш годныя грошы.

Надзвычай актуальным для іншагародніх выпускнікоў аспірантуры застаецца жыллёвае пытанне, паколькі рэдкая арганізацыя можа пахваліцца наяўнасцю свайго інтэрната. Да таго ж пры фарміраванні кошту за карыстанне інтэрнатам прымяняюцца стаўкі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэтаў, якія значна вышэйшыя за тарыфы, якія прымяняюцца ў дачыненні да студэнтаў. Не прадугледжаны для маладых выкладчыкаў і кампенсацыі па найме жылля. Галіновы прафсаюз спрабуе вырашаць гэтыя пытанні праз увядзенне ў калектыўных дагаворах розных нетарыфных выплат маладым навукоўцам і выкладчыкам, але іх магчымасці ў вырашэнні гэтага пытання таксама абмежаваныя.

Рэгістрацыю ў сталіцы выпускнікам аспірантуры ўвогуле даводзіцца «купляць», таму што ВНУ і навуковыя арганізацыі не надзеленыя правам часовай рэгістрацыі па сваім юрыдычным адрасе размеркаваных у іх распараджэнне іншагародніх выпускнікоў. Выйсцем магло б стаць выдзяленне квотаў на рэгістрацыю іншагародніх маладых выкладчыкаў у сталіцы і абласных цэнтрах, а таксама будаўніцтва інтэрнатаў для маладых выкладчыкаў або стварэнне ў студэнцкіх інтэрнатах, што будуюцца, паверхаў або секцый для маладых выкладчыкаў. Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што пытанне з забеспячэннем жыллём у інтэрнатах для студэнтаў у сталіцы не менш актуальнае...

**Апошнім часам пасля завяршэння навучання ў аспірантуры толькі 5-8 працэнтаў выпускнікоў абараняюць кандыдацкія дысертацыі і атрымліваюць дыплом кандыдата навук. Астатнім жа выпускнікам, нягледзячы на засваенне методык правядзення навуковых даследаванняў і набыццё навуковай кваліфікацыі, па розных прычынах не ўдаецца прадставіць да абароны сваю дысертацыю і ніякага дакумента, які б пацвярджаў іх паспяховае навучанне ў аспірантуры і набытыя навыкі арганізацыі даследчай работы, яны не атрымліваюць.**

Дзве балючыя праблемы агучылі самі аспіранты, якія далучыліся да дыскусіі. **Чаму аспіранцкія стыпендыі абкладаюцца падаходным падаткам, але ў той жа час выплаты па сацыяльным страхаванні на час іх хваробы не прадугледжаны?** Калі хвароба аспіранта доўжыцца менш за месяц, то за ім захоўваецца стыпендыя па месцы вучобы, а калі больш чым месяц, то навучанне перарываецца і, адпаведна, ні стыпендыя, ні дапамога з Фонду сацыяльнага страхавання па хваробе аспіранту не выплачваецца... **Да таго ж аспіранты абмежаваныя ў праве праходзіць лячэнне ў студэнцкіх санаторыях-прафілакторыях ВНУ, якія датуюцца за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва...**

**Кансультант Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Сяргей НІКАНОВІЧ** агучыў ініцыятыву камітэта аб павелічэнні прыёму ў магістратуру да 10 працэнтаў ад колькасці выпускнікоў адпаведных вышэйшых навучальных устаноў. Але маладыя людзі не вельмі ахвотна ідуць у магістратуру. Цікава, чаму? Можа, з той прычыны, што стыпендыя магістранта сёння складае ўсяго 105 тысяч рублёў, гэта значыць, што яна нават меншая, чым у студэнтаў 3-5-га курсаў? Дык навошта працягваць навучанне? Падчас «круглага стала» была агучана прапанова давесці памер стыпендыі магістранта хоць бы да 50 працэнтаў ад аспіранцкай стыпендыі, інакш маладыя людзі і далей будуць шукаць шляхі для самарэалізацыі за сценамі вышэйшых навучальных устаноў.

Шырокі рэзананс выклікала выступленне **дактаранта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, кандыдата псіхалагічных навук, дацэнта Галіны ВЕРЖЫБОК**, якая ўзняла праблемы сацыяльнага статусу дактарантаў і неабходнасці прызначэння даплат за вучоныя званні і ступені дактарантам, якія не маюць выкладчыцкай нагрузкі.

***Дацэнт Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук Марына РАГАЧЭЎСКАЯ*** засяродзіла ўвагу аўдыторыі на праблемах сушукальнікаў вучоных ступеняў, тэмы дысертацый якіх былі зацверджаны да ўступлення ў сілу Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 лістапада 2004 года № 560 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб прысваенні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь». Раптам высветлілася, што тэмы іх дысертацый, па меркаванні членаў Прэзідыума Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, не з'яўляюцца актуальнымі і запатрабаванымі. Вельмі многім спецыялістам у сферы гуманітарных навук, псіхалогіі, педагогікі і методыкі выкладання замежнай літаратуры было адмоўлена ў прысваенні ім вучоных ступеняў. Такая дыскрэдытацыя прадстаўнікоў гуманітарных навук абавязкова будзе мець сумныя наступствы... У галіне замежнай літаратуры дактароў навук у Беларусі сёння можна пералічыць па пальцах, а дактароў навук па англійскай літаратуры (адной з вядучых сусветных літаратур), у нашай краіне ўвогуле няма ніводнага! У ВНУ ўжо няма каму выкладаць курс замежнай літаратуры, які прадугледжаны вучэбнай праграмай.

— Апошнім часам чамусьці сталі забывацца, што адзін з аспектаў падрыхтоўкі навуковых кадраў — гэта падрыхтоўка педагагічных кадраў для вышэйшай школы. Магчыма, што не кожны псіхолаг або лінгвіст зробіць адкрыццё, якое адназначна можна будзе назваць інавацыйным. Але для адукацыйнага працэсу яго навуковая работа будзе мець практычнае прымяненне, — выказаў сваё меркаванне ***намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА***. — Да таго ж, чаго хаваць, нават у вядучых ВНУ дактароў навук сёння няма па цэлым шэрагу спецыяльнасцяў. Адсутнасць кадраў, гэта і сапраўды вялікая праблема для вышэйшай школы...

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!

**Беларус — гэта не проста званне па нараджэнні, альбо саманазва пэўнай часткі насельніцтва. Гэтаксама як і рускі. Бо можна быць рускім, але не быць расіянінам, ды наадварот. Быць беларусам і не быць ім адначасова — ці магчымы такі варыянт? На жаль, цяпер сапраўднасць дыктуе нам адну акалічнасць: беларусамі не нараджаюцца — беларусамі становяцца, і — кожны, вядома, сваім шляхам. Штосьці даходзіць да гэтага пранікненнем беларускім духам, згодна з выслоўем аднаго мастака: «Галоўнае не тое, каб я размаўляў па-беларуску, а каб думаў па-беларуску!» Але ўсё ж... Мова з'яўляецца тым падмуркам, на якім пабудавана наша з вамі жыццё, наш народ і наша асоба. А таму быць разам з роднай мовай — наш з вамі абавязак...**

**21 лютага — Міжнародны дзень роднай мовы.** Не, не менавіта беларускай, а ўвогуле ўсіх моваў, якімі цяпер карыстаюцца людзі. Бо забыццё сваіх каранёў шырока распаўсюдзілася па ўсёй зямлі. Па прыклады далёка хадзіць не трэба: Нідэрланды, Швейцарыя, Казахстан і г. д. Так, глабалізацыя не стаіць на месцы! І магло так здарыцца, што, у прынцыпе, усе лакальныя адрозненні былі б сцёртыя, а мы б апынуліся пад англійскай культурай, напрыклад. Хтосьці можа запярэчыць, маўляў, калі будзе агульная мова, дык жыць будзе лягчэй, бо ўсе будуць адзін аднаго разумець; жыць у любой частцы планеты, дзе душа пажадае... Але давайце падумаем, як гэта будзе выглядаць! Ці цікава вам было б шпацыраваць па садзе, у якім растуць аднолькавыя ружы? Альбо наколькі захапляльны быў бы выбар «другой палавінкі», калі б усе былі аднолькавыя да шраму на твары?.. Думаецца, не вельмі. Нездарма ж існуе такое мноства розных відаў жывёлінаў, раслін ды нават бактэрый. Бо ПРЫГАЖОСЦЬ — У АДРОЗНЕННІ. І гэта закон прыроды, які нам ніяк нельга ігнараваць.

Дакладна, каб зберагчы ўсе асаблівасці кожнага народа зямлі, было прыдумана гэтае свята. Але чым дакладна кожны з нас можа паспрыяць роднай мове, хоць бы ў адзіны дзень года і тым самым прыемна прабавіць час? Адказ ужо ляжыць на паверхні: РАЗМАЎЛЯЙМА ПА-БЕЛАРУСКУ! — а тут ужо цэлая прастора для імправізацыі...

Колькі гадоў таму, яшчэ калі я навучаўся ў гімназіі, мы разам з сябрамі ладзілі занятку-агіткі, на якіх заахвочвалі сваіх настаўнікаў тым, што проста адказвалі навучальны матэрыял па-беларуску. Спачатку, вядома, гэта шакіравала і настаўнікаў, і ўсіх аднакласнікаў, але пасля яны пераходзілі з намі, так бы мовіць, на адну хвалю і раптам усе асэнсавалі сябе сапраўднымі беларусамі... Пазней, як ужо вучыўся ва ўніверсітэце, зноў успаміналі пра родныя навучальныя ўстановы ды расклейвалі вялікія шыльдачкі, у якіх заклікалі больш маладое пакаленне ўспомніць пра свае карані і перасягнуць нас.

*О, Беларусь!.. — Няхай усклікну*
*І я — за волатамі ўслед.*
*Як пілігрым нясе малітву —*
*Так я нясу іх запавет.*

Гэтыя радкі народнага паэта Ніла Гілевіча натхнілі нас да пазнання роднай Беларусі. У першую вандроўку па Радзіме я рушыў, прачытаўшы невялічкую «Зямлю пад белымі крыламі» Уладзіміра Караткевіча. А пасля ў Гальшанах, маім першым пункце вандравання, атрымаў вялікую долю імпэту на ўсё наступнае жыццё, калі пачуў выразную беларускую гаворку мясцовых жыхароў, якія па сваёй шчырасці ўсялякім чынам прапаноўвалі нам дапамогу, прытулак... А пазней, як гойсалі ля Кушлянаў — радзімы Францішка Багушэвіча! Два зусім незнаёмыя нам чалавекі зрабілі тое, бадай, чаго ад каго іншага чакаць не выпадала: не шкадуючы часу і грошай, падкінулі нас да сядзібы вялікага пісьменніка, пачакалі колькі часу, дый давезлі да чыгуначнай станцыі Солаў. І гэта толькі дзеля таго, каб мы (!) духоўна ўзбагаціліся наведваннем сядзібы! І, зразумела, душэўная размова пра ўсё набалелае...

Вось за што я люблю беларусаў! Бо можна зайсці да незнаёмага чалавека ў госці і папытаць начлегу, альбо далучыцца да настольнага тэнісу з іншымі — і нідзе ты не будзеш адрынуты. Відаць, таму пра гасціннасць нашага народа ходзяць легенды; відаць, таму Беларусь прапанавала прытулак прадстаўнікам многіх народаў свету і для шмат каго стала другой Радзімай.

Люблю Беларусь — і тым ганаруся! Вось так хочацца жыць, так шукаць сваю долю і лёс, такім чынам перамагаць ва ўсіх, нават самых маленькіх, справах. І тады наш народ разам са сваёй дзяржавай узнімецца і зойме тое месца, што ўжо даўно прыгатаванае нам Богам. А таму без аніякай палітыкі, што не мае да духу ніякага дачынення, можна прамовіць: «Няхай жыве Беларусь! Жыве наш народ, родны кут, матчына мова!..»

...Усё вышэй сказанае можна было б аднесці да простай дэмагогіі, каб не тая акалічнасць, што шмат людзей ужо займаюцца падрыхтоўкай да Дня роднай мовы. Гэта і студэнты, якія ўжо праводзяць «Тыдзень роднай мовы» на філалагічным факультэце БДУ; гэта і супрацоўнікі Інстытута мовы і літаратуры, дзе 18 лютага праходзіла канферэнцыя, прысвечаная гэтаму святочнаму дню; гэта і звычайныя вучні сярэдніх навучальных устаноў, прынамсі, 15-я мінская гімназія, што ўласнаручна вырашыла правесці шэраг мерапрыемстваў. Сярод найбліжэйшых грамадскіх ініцыятыў можна адзначыць святкаванне 10-годдзя правядзення Міжнароднага дня роднай мовы, а таксама правядзенне агульнанацыянальнай дыктоўкі. Як паведамляе **намеснік старшыні Таварыства беларускай мовы Алена АНІСІМ**, «кожны, хто прыйдзе ў адпаведныя ўстановы і ў адпаведны час, узяўшы разам з сабой звычайную асадку, мае магчымасць паўдзельнічаць у практычным выяўленні сваіх ведаў па беларускай мове». Варта дадаць, што такога кшталту дыктоўкі ўжо займелі пэўную долю папулярнасці ў шэрагу краінаў Еўропы, бо далучыцца да яе можна і скарыстаўшыся радыё...

**Наша мова шмат чаго пабачыла ў сваім жыцці, яна ішла праз усю гісторыю разам са сваім народам, як самая верная сяброўка. Але і народ не пакідаў яе ніколі, ён ніколі не забываўся на яе, як не забываюцца на сваю маці. А мо таму наша мова і завецца матчынай?**

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

Этнаскарбонка

# Разводаў і сямейных канфліктаў магло б быць менш, калі б мы выхоўваліся па-беларуску

Чаму ў сучасных сем'ях так многа канфліктаў? Чаму колькасць разводаў павялічваецца? А ці не звязана гэта з тым, што мы не прытрымліваемся тых правілаў паводзінаў, што былі ў нашых прадзедаў? Наколькі сямейна-бытавая галіна існавання цяперашніх гараджан захавала традыцыйныя погляды беларусаў? Адказы на гэтыя пытанні шукала **дактарант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук Ірына КАЛАЧОВА**. Яна правяла апытанні 800 беларускіх сем'яў з розных гарадоў, у выніку якога высветлілася, што традыцыі, якіх прытрымліваліся беларусы, працягваюць існаваць і ў сучасных сем'ях, але назіраецца не зусім суцяшальная тэндэнцыя: сэнс, які яны неслі, губляецца. Больш за тое, некаторыя абрады не вядомыя гарадскім сем'ям.

**ДАНІНА ТРАДЫЦЫІ?**

Так, 90 працэнтаў апытаных гараджан адказалі, што ў іх дзяцей ёсць хросныя бацькі, але толькі 40 працэнтаў бачаць у гэтых асобах маральных настаўнікаў, яшчэ столькі ж хрэсьбіны ўспрымаюць як даніну звычаю, стэрэатып, а 20 працэнтаў наогул не надаюць абраду ніякага значэння. І насамрэч сёння для большасці гарадскіх дзяцей хросныя бацькі — не больш, чым людзі, якія па вялікіх святах робяць падарункамі. «Гэта адлюстроўвае ўсю тэндэнцыю зносін. Эмацыянальна-пачуццёвыя зносіны замяняюцца іншымі сродкамі, людзі менш сустракаюцца, радзей глядзяць адно аднаму ў вочы. Кола блізкіх людзей, якія маглі б уздзейнічаць на дзіця, сярод якіх павінны быць і хросныя бацькі, звужаецца», — заўважае Ірына Іванаўна. Ды і сам абрад хрэсьбінаў згубіў шмат цікавых элементаў. Пасля царкоўнай часткі людзі збіраюцца за звычайным застоллем. А пра рытуальную бабіну кашу, з дапамогай якой імкнуліся заручыцца падтрымкай багоў «на шчаслівы лёс дзіцяці», мала хто з сучаснікаў ведае. Варыла кашу часцей павітуха і імкнулася зрабіць яе як мага смачнейшай, маўляў, калі гасцям спадабаецца, то спадабаецца і багам. Каша адарвалася грашыма і пры гэтым людзі выказвалі свае зычэнні ў адрас новнароджанага. Пасля рэвалюцыі, калі рэлігія стала «опіумам для народа», практыкаваліся «чырвоныя хрэсьбіны». Удзельнікі новага абраду слухалі «камуністычныя» лекцыі і спявалі Інтэрнацыянал.

Абрад праведвання новнароджанага і парадзіхі таксама паступова знікае. Сёння на адведкі трапляе толькі вузкае кола людзей, а раней усе замужнія жанчыны імкнуліся праведаць парадзіху, да тых, хто ігнараваў гэта, ставіліся з непавагай і асуджэннем.

Повязь паміж пакаленнямі адлюстроўвае традыцыя матэрыяльнай і маральнай дапамогі бацькамі дзецям і наадварот. Так у традыцыйнай беларускай сям'і бацькі апякалі сваіх дзяцей, пакуль тыя не адасабляліся і не пачыналі асобнае жыццё.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Наш фармат

## «МЫ ПАЧЫНАЕМ КВЗ...»

**21 лютага ў Ліцэі Белдзяржуніверсітэта пройдзе фестываль Адкрытай лігі КВЗ БДУ, на якім вызначацца каманды, што возьмуць удзел у сезоне 2009 года.**

Для ўдзелу ў фестывалі былі пададзены 33 заяўкі ад усіх факультэтаў БДУ, а таксама з іншых ВНУ сталіцы. Каманды прадэманструюць свае «візіткі», а журы адбярэ 16-18 найбольш вясёлых і знаходлівых камандаў, якія і прадоўжаць свае выступленні ў Адкрытай лізе КВЗ БДУ.

Ліга КВЗ БДУ існуе з 1994 года, а з 1997 года яна стала адкрытай. За прайшоўшы час было праведзена 14 турніраў, удзел у якіх узялі каля паўтары сотні камандаў, якія прадстаўлялі не толькі факультэты Белдзяржуніверсітэта, але і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы: БДЭУ, БДПУ, БДМУ, БДТУ, БНТУ, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі інстытут правазнаўства і іншыя.

Пераможцы Адкрытай лігі КВЗ БДУ атрымліваюць Кубак і права ўдзелу ў Сочынскім фестывалі камандаў КВЗ. Па выніках сезона вызначаюцца таксама лепшы гулец КВЗ і пераможцы ў намінацыях «Лепшы жарт», «Лепшы нумар» і «Лепшы акцёр». Адкрытая ліга КВЗ БДУ з'яўляецца афіцыйнай лігай Міжнароднага саюза КВЗ «АМіК Беларусь».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Новая вуліца ў мінскім мікраараёне Вясёлкавы

**У сталічным мікрараёне Вясёлкавы, у межах праспект Пераможцаў — праезд Дразды — рака Свіслач, запраектавана новая вуліца. Як расказалі ва ўпраўленні культуры Мінгарвыканкама, для яе ўжо падабрана назва — Крупецкая. Так новую вуліцу назавуць у гонар абраза Крупецкай Божай Маці.**

Паводле падання, святыня была набытая ў пачатку XVII стагоддзя на крыніцы каля вёскі Крупцы, якая размяшчаецца недалёка ад цяперашняга Вясёлкавага. У 1612 годзе на месцы крыніцы была пабудавана капліца, дзе спачатку знаходзіўся абраз. Пазней там жа была ўзведзена царква, куды і перанеслі святыню. У багаборніцкім 1936 годзе храм знеслі, а Крупецкі абраз Божай Маці знік. Цяпер на гэтым месцы пабудавана Свята-Пакроўская царква.

**Алена КУРЭЦ,** *«Мінск—Навіны».*




БГУИР — знания и стиль жизни!

Учреждение образования

«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНФОРМАТИКИ И РАДИОЭЛЕКТРОНИКИ»

ПРОВОДИТ ДЕНЬ ОТКРЫТЫХ ДВЕРЕЙ 28 февраля 2009 г.

по адресу: ул. П. Бровки, 4, учебный корпус № 2, 2 этаж, актовый зал. Начало в 14.00.

**В программе:** встреча с ректором, деканами факультетов и ответственным секретарем приемной комиссии.

Подробная информация: т. 293 88 15, http://abitur.bsuir.by http://www.bsuir.by



# ЧАМУ МОЛАДЗЬ НЕ ІМКНЕЦЦА ЗВЯЗВАЦЬ СВАЮ БУДУЧЫНЮ З НАВУКАЙ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***Галоўны вучоны сакратар Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, кандыдат хімічных навук Ніна ГУЛЬКО*** расказала пра 9 новых прававых актаў, унесеных ВАК на ўзгадненне ў беларускі Урад. Сярод іх праект Указа Прэзідэнта «Аб некаторых пытаннях падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь», новае Палажэнне аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні вучоных званняў, Інструкцыя аб арганізацыі работы ў сістэме пасляўніверсітэцкай адукацыі і праект Палажэння аб штогадовым конкурсе на лепшую доктарскую і кандыдацкую дысертацыі (усе гэтыя дакументы можна знайсці на сайце ВАКа www.vak.org.by).

Згодна з праектам Указа Прэзідэнта, **пачынаючы з 2010 года, выпускнікам аспірантуры будзе прысвойвацца навуковая кваліфікацыя «Даследчык»** у адпаведнай галіне з выдачай дыпломаў вызначанага ўзору. Аспірантамі, якія паспяхова завяршылі навучанне ў аспірантуры, будуць лічыцца тыя, хто ў адпаведнасці з заключэннем дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі, зможа на працягу трох гадоў пасля заканчэння навучання завяршыць работу над дысертацыяй і прадставіць яе для абароны. Выпускнікі аспірантуры з навуковай кваліфікацыяй даследчыка, якія будуць працаваць па размеркаванні ў адпаведнасці з дзяржаўным заказам, змогуць атрымліваць **даплату ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду**. Праўда, ВАК настойваў на даплаце ў памеры двух тарыфных ставак, але Міністэрства працы іх прапанову не падтрымала.

— Можна меркаваць, што дзякуючы вынясенню часткі вучэбнай аспіранцкай нагрузкі за рамкі аспірантуры — здачы агульнаадукацыйных кандыдацкіх экзаменаў у магістратуры — працэнт асобаў, якія закончаць аспірантуру з прадстаўленнем да абароны дысертацыі, істотна ўзрасце. Аднак у шэрагу галін навукі, напрыклад, у сельскагаспадарчай галіне, медыцыне або ў тэхнічнай галіне патрабуецца пацвярджэнне карыснасці вынікаў навуковых даследаванняў іх практычнай рэалізацыяй. У гэтых выпадках завяршыць работу над дысертацыяй у час навучання ў аспірантуры вельмі праблематычна. А як ужо гаварылася раней, зарплата ў малодшага навуковага супрацоўніка не спрыяе замацаванню высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў. На завяршэнне работы над дысертацыяй мы даём выпускніку аспірантуры тры гады. Пры гэтым у іх ёсць моцны стымул для паскарэння завяршэння работы над дысертацыяй, паколькі пасля яе паспяховай абароны даплата можа ўзрасці да чатырох тарыфных ставак першага разраду, — падкрэсліла Ніна Гулько.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падводзячы вынікі «круглага стала» ***старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА*** падкрэсліў, што і дзяржаве, і прафсаюзам яшчэ шмат трэба будзе зрабіць для павышэння прэстыжу прафесіі навуковага работніка і выкладчыка ВНУ. З гэтай мэтай была створана рабочая група з кола прадстаўнікоў галіновага прафсаюза і ўсіх зацікаўленых бакоў па ўнясенні прапаноў у адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання. Адна з іх — узаконіць выпускнікам аспірантуры адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу для абароны дысертацыі тэрмінам да аднаго года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Калі б мы выхоўваліся па-беларуску

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

У сваю чаргу падтрымка састарэлых бацькоў была святым абавязкам. Раней дзядулі і бабулі не ведалі, што такое адзінокая старасць, па звычаі з імі заставаўся і даглядаў хто-небудзь з дзяцей, часцей — малодшы сын. А сёння мы сутыкаемся з тым, што састарэлыя людзі разлічваюць часам толькі на падтрымку... органаў сацыяльнай дапамогі, а зусім не сваіх нашчадкаў. Цікава, што ж апошнія атрымаюць пасля ўжо ад сваіх малых. У беларусаў ёсць казка пра жанчыну, якая нядобра ставілася да старога бацькі, карміла яго за печчу з драўлянай міскі. Але, калі яна ўбачыла, што яе маленькі сын рыхтуе ёй такі ж посуд, спахапілася.

Сярод апытаных сем'яў большасць лічаць, што галоўнае — не матэрыяльная дапамога, а добразычлівасць, спрыяльнасць, удзел у агульных сямейных справах. Чым меншы горад, тым мацнейшая сувязь паміж пакаленнямі, большая захаванасць традыцыі ўзаемападтрымкі, талочнасці, калектыўнасці. І калі бацькі па-ранейшаму працягваюць клапаціцца пра дзяцей, дык апошнія ўсё часцей перарываюць традыцыю.

Раней у беларускіх сем'ях складваліся асаблівыя адносіны да маці. Да яе звярталіся паважліва, «на Вы», паміж дзецьмі і маці былі аберагальныя адносіны, людзям уласцівы былі клопат, выказванне слоў удзячнасці, выбачэння, пакаяння. Калі нашчадкі ад'язджалі ў далёкі край, жаніліся, выходзілі замуж, была такая традыцыя: папрасіць у блізкіх прабачэння, пакаяцца. Сёння гэта тонкая сувязь парушана. І ўсё радзей да маці звяртаюцца па параду, абмяркоўваюць з ёй сваё жыццё.

## Дасі дзецям волю, адбярэш долю

Старэйшае пакаленне часам дзівіцца з сучасных дзяцей: мы такімі не былі. А нічога дзіўнага ў гэтым няма, сістэма перадачы традыцыйнага выхавання парушана, змяніўся сам лад жыцця. Раней дзецям і бацькам даводзілася разам завіхацца па гаспадарцы. Ненармальна было, каб дзяўчына на выданні не ўмела гатаваць, шыць. Яе з маленства навучалі ўсяму. Нявеста, якая не ўмела нічога рабіць, асмейвалася, называлася няздольніцай, трапляла ў лік «неперспектыўных». Але глядзіце, што яшчэ стаяла за агульнай працай. Калі малыя корпаліся разам з дарослымі, пераймаючы ад іх пэўныя ўменні, яны маглі атрымаць ад іх пахвалу, параду, што ўздымала іх самаацэнку, пагутарыць, карацей, проста быць разам. Сёння на зносіны паміж дзецьмі і бацькамі застаецца ўсё менш часу : дарослыя ходзяць на сваю працу, малыя — на сваю (менавіта так мае дзеці, і малыя знаёмых успрымаюць паход у садок ці школу). Нават нормай становіцца бацькоўская пазіцыя, што выхоўваць дзяцей павінны дзіцячы садок і школа. Акрамя таго, з самага ранняга ўзросту дзеці наведваюць разнастайныя гурткі, спартыўныя секцыі. Усё большую ролю ў выхаванні дзяцей адыгрывае асяроддзе, дадайце сюды яшчэ тое, што вялікую колькасць інфармацыі яны атрымліваюць з тэлевізара, камп'ютара.

Адсюль і такія разыходжанні паміж дарослымі і дзецьмі, адсюль і праблема дзіцячага непаслухмянства, а пасля і разыходжанні паміж старэйшым і малодшым пакаленнямі. З дзяцінства дзеці вучацца абыходзіцца без нас, жыць сваім, а не агульным з намі жыццём.

Узгадаю сваіх родзічаў. Пасля смерці дзеда 10 гадоў сямейным кланам кіравала бабуля, усе яе пяць дзяцей пераехалі ў горад, але што ні выхадны, яны вярталіся на вёску ўжо са сваімі сем'ямі. Часам нашчадкаў наязджала столькі, што даводзілася на начлег слаць на падлозе. У бабулі ніхто не сядзеў без справы. Яе паважалі, з ёй лічыліся, да яе звярталіся па параду. І пакуль яна жыла, увесь наш род са шматлікімі адгалінаваннямі быў больш дружным, чым пазней, калі яе не стала. Яднала не бабуля, а традыцыя, якая за ёй стаяла. Такіх стасункаў, як у бабулі і яе дзяцей, няма ўжо ў нашчадкаў.

Магчыма, прычына не толькі ў тым, што ў горадзе дарослыя вымушаны менш часу быць з дзецьмі. Раней беларусы жылі вялікімі сем'ямі. Лічылася шчасцем, калі малых многа: «Багаты Аўдзей, поўна хата дзяцей», «З дзеткамі гора, а без іх — удвое», «Адно дзіця — не дзіця, два дзіцяці — паўдзіцяці, тры дзіцяці — ужо дзіця». Старэйшыя дочкі маглі пераймаць ад маці веды, як глядзець за немаўляткам. Яны бачылі, як маці з ім песціцца, слухалі калыханкі, адчувалі стаўленне да дзіцяці як да вялікай каштоўнасці. Ды самі часта станавіліся нянькамі сваім брацікам і сястрычкам. Акрамя таго, сярод традыцый беларусаў было жыць нераздзеленымі сем'ямі, калі пад адным дахам тулілася некалькі пакаленняў і шлюбных пар ужо са сваімі дзецьмі, звязаных прамым ці бакавым сваяцтвам. Таму вясковыя хлопчыкі і дзяўчынкі адразу атрымлівалі мадэль паводзінаў. Яны пераймалі паважлівыя адносіны малых да дарослых, бачылі як размяркоўваюцца жаночыя і мужчынскія абавязкі і якім чынам іх бацькі ставяцца да дзядоў. Кожнай новай маладой сям'і не трэба было ствараць правілы выхавання, усё пераймалася само сабой. А што ў сучаснікаў? Калі ёсць магчымасць жыць асобна ад бацькоў, маладая сям'я абавязкова яе выкарыстае. Малыя растуць, не бачачы традыцыйнай мадэлі выхавання, часта маладым бацькам даводзіцца прыдумляць нешта сваё. Калі раней бясспрэчнай і галоўнай функцыяй сям'і лічылася прадаўжэнне роду, дык сёння гэта невелюецца іншымі рэчамі, ад шлюбных пар можна пачуць, што ім «няма за што выхоўваць дзяцей» ці «трэба рабіць кар'еру». Такія думкі нашым продкам, напэўна, падаліся б дзікімі, узгадаем прымаўку: «Бог даў дзяцей, дасць і на дзяцей».

«Раней сям'я была вельмі інтымным, утульным месцам, паўплываць на яе звонку было вельмі цяжка, яна выпрацоўвала свае механізмы захавання, — заўважае Ірына Калачова. — У сучаснай інфармацыйнай прасторы ўсё інакш. Яшчэ сто гадоў таму дзіця — цэнтр усяго. А паглядзіце, колькі сёння сацыяльных сірот. Становіцца нармальным стаўленне да няпоўнай сям'і, хаця ў нашых продкаў яна не лічылася паўнавартаснай. Напэўна, гэта сведчыць аб тым, што многае з таго, што захоўвалася стагоддзямі, згублена ў дзіцячабацькоўскіх адносінах. Нам трэба згуртоўвацца, а мы, наадварот, усё больш разыходзімся».

Нашы продкі адчувалі, што дзяцей трэба абавязкова выхоўваць: «Дасі дзецям волю, адбярэш долю». І пачынаць гэта яшчэ з нараджэння дзіцяці, «калі яно ляжыць упоперак ложка, а не ўздоўж». Бацькоўскія наказы адлюстраваны ў прыказках і прымаўках: «Працаваць не будзеш, паважаным чалавекам не станеш», «Паважай іншых — і цябе паважаць будуць», «Любі родную хатку, як родную матку». У беларусаў быў свой погляд на тое, якім павінен быць добры чалавек: працавітым, сумленным, гасцінным, фізічна моцным. Нездарма існаваў у нас абрад «дзядзькавання», калі беларуская шляхта на пэўны час пакідала сваіх дзяцей у сялянскіх сем'ях. Лічылася, што так малыя набудуць працавітасць, любоў да зямлі, стануць больш дужымі і трывалымі.

З даўніх часоў у беларусаў было асаблівае стаўленне да дзяцей: яны не паказвалі сваю любоў яўна, не праяўлялі пяшчоту на людзях, але ўсіх сябе прысвячалі малым. Гэтыя паводзіны, якія выяўляюць нашу беларускасць, уласцівыя і сучасным сем'ям. Прынамсі, працягвае жыць і традыцыя называць малых у гонар кагосьці з продкаў і такім чынам перадаваць дзіцяці лепшыя якасці, што былі ўласцівыя чалавеку, які яго насіў.

Прыказкі, прымаўкі, казкі, паданні, легенды, песні дапамагалі выхоўваць дзяцей, садзейнічалі фарміраванню асновы духоўнай і эстэтычнай культуры дзяцей. У іх — і адлюстраванне светапогляду беларусаў. Гэткую ж ролю адыгрывалі і святы.

Некаторыя традыцыі выхавання пачынаюць адраджацца. Сёння папулярнымі сталі пальчыкавыя гульні: маці расказвае вершык пра сароку, што кашу варыла, дзетак карміла, і па чарзе загінае пальчыкі малога. Ні пра якія навуковыя абгрунтаванні, што падобныя гульні спрыяюць развіццю дробнай маторыкі і ранейшаму авалоданню мовай, нашы бабулі не ведалі, але яны інтуітыўна адчувалі, што гэта ідзе на карысць малому.

Напэўна, мы некалі вернемся і да іншых старых традыцый, гэта ўмова жывучасці нашага этнасу са своеасаблівай самабытнай культурай. Вось толькі калі раней яны перадаваліся самі па сабе, дык цяпер, на жаль, многаму трэба вучыцца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# КАХАННЕ Ў ГІСТОРЫІ

**Пра заслугі вядомых палітычных, ваенных, грамадскіх або культурных дзеячаў мы чулі даволі шмат, а вось пра іх душэўныя памкненні, летуценні, пачуцці сімвалічна было б пагаварыць напярэдадні вясны.**

## Муза творчасці

Якую расліну трэба адшукаць на Купалле, каб стаць шчаслівым? «Вядома, папараць-кветку», — адкажуць усе. Ды, не, не ўсе: адказ дзяўчат з Туганавіч і навакольных мясцін будзе гучаць незвычайна: бярозу!..

З тае пары прайшло шмат часу, ужо не адно пакаленне мястэчкоўцаў перадае спадкаемцам рамантычную, але трагічную гісторыю кахання. Славуты беларускі і польскі паэт Міцкевіч на развітанне са сваёй каханай Марыляй выкапаў непадалёк бярозку і пасадзіў яе ў дзіравы кошык. Разумела Марыля тое, што ён сказаў у апошнюю хвіліну, але не магла нічога зрабіць, і ад гэтага боль быў яшчэ мацнейшым: «Няхай расце яна і стане памяццю аб тым, што быў час, калі дзяўчаты выходзілі замуж без кахання...». Да таго часу, пакуль не з'ехала Марыя Верашчака з Туганавіч, роднага свайго гнязда, даглядала гэтую бярозку, палівала сваімі горкімі слязьмі, песціла пяшчотнымі рукамі, засланяла ад моцнага ветру. Кажуць, што нават у сонечныя дні лісце бярозкі было мокрым ад слёз Марыі.

...Час ішоў. Бярозка падрастала, дужэла і кожнаму нагадвала пра нешчаслівае каханне. Падчас Першай сусветнай вайны дрэўца загінула. Аднак мясцовыя дзяўчаты да гэтага часу спадзяюцца адшукаць легендарную бярозку на Купалле, каб быць шчаслівым не толькі ў жыцці, але і ў каханні.

...Пазнаёміліся яны ў 1820 г. на дзень імянінаў Марылі Верашчакі. Тады Міцкевіч адчуў нейкую наканаванасць лёсу: абодва яны нарадзіліся на Навагрудчыне і ў адзін дзень — 24 снежня, толькі ў розныя гады. Ён быў старэйшы на адзін год.

Не знешняй сваёй прыгажосцю прывабіла да сябе маладога паэта, а ўнутранай. Сучаснікі таго часу, сябры Міцкевіча, неаднойчы пісалі, што Марыя «не магла назвацца прыгожай», але мела такое душэўнае характство, такі чулы і добры позірк, што ўмеў зачараваць Міцкевіча. Яшчэ больш рабіла яе прывабнай тое, што яна была вельмі адукаванай, ведала некалькі моваў, цудоўна спявала і нават спрабавала пісаць вершы да п'есы.

Успыхнула шчырае, чулае і ўзаемнае каханне. Але ж нядоўга давялося сустракацца ў рамантычным туганавіцкім парку. Не толькі родзічы дзяўчыны не далі згоды на шлюб, але, як гэта ні дзіўна, і сама Марыя адмовіла паэту. Яна ж так шчыра кахала яго, але... была дзяўчынай выхаванай, верніцай і не магла парушыць словы, дадзеныя перад Богам і перад графам Путкамерам. Да сустрэчы з Міцкевічам яна была ўжо заручана з графам! І нічога не магла з гэтым зрабіць.

Вобраз каханай Марылі, як ласкава называў яе Міцкевіч, можна адшукаць у шматлікіх творах паэта. Гэтае вялікае пачуццё кахання ён пранёс праз усё жыццё і творчасць. Хто ведае, можа менавіта гэта гісторыя кахання стала музай усёй выдатнай творчасці Міцкевіча?

Толькі на трыццаць шостым годзе жыцця тады ўжо парыжскі эмігрант Міцкевіч ажаніўся з Цэлінай Шымашоўскай. У іх было шасцёра дзяцей. Як вы думаеце, як Міцкевіч назваў сваю першую дачушку? Вядома, Марыя...

Да гэтага часу ў Туганавічах захавалася своеасаблівая «альтанка»: шэсць ліп, якія быццам бы растуць з аднаго кораня, сваімі кронамі стварылі цень ад спякотнага сонца закаханым — Адаму і Марылі. Нездарма ў Міцкевіча мы знойдзем успамін, які быў з ім заўжды:

*«Альтанка! Шчасця майго калыбель і магіла!*

*Тут спаткаўся, тут і развітаўся...».*

## T&T

*«Ты, сэрца майго ажыўленне, ты, якая павінна была стаць асалодай усяго майго жыцця, Тэклюся. Даруй, што не найду патрэбных слоў... Адхілены тваім бацькам, і цябе павінен пазбавіцца. Аднак вобраз твой застанецца ў маім сэрцы назаўсёды. Буду дыхаць тваім дыханнем і жыць тваім сэрцам. Твой цень будзе вечна мяне суправаджаць. Пра што ні думаў бы я, перад маім позіркам будзе стаяць твой вобраз, хоць ён робіць мяне няшчасным...». Так пісаў палітычны дзеяч, змагар за свабоду Тадэвуш Касцюшка да сваёй каханай Тэклі Жураўскай. А здаецца, што пісаў паэт, бо такія ўжо паэтычныя і меладычныя словы! Пасля няўдалага кахання з Людвікай Сасноўскай (у каханні яму не лёсіла) прайшоў час, і сэрца чакала новых пачуццяў.*

У 1791 г. Тадэвуш пазнаёміўся ў Мяджыбажы на Падоллі з 17-гадовай Тэкляй. У Касцюшкі не магла не ўзнікнуць думка пра тое, што ўзрост, генеральскі чын, слава і вядомасць у Рэчы Паспалітай паспрыялі таму, што яшчэ юная дзяўчынка закахалася ў 45-гадовага Тадэвуша. Але ж памыляўся! Яны сышліся сэрцам, а не знатнасцю. Інтэлігентная дзяўчына, сціплая, выхаваная, адукаваная была да таго ж яшчэ і прыгожай: ладная постаць, густая каса, чыстыя вочы... Але колькі ні прасіў Касцюшка ў бацькі рукі Тэклі, колькі ні пісаў, нават тое, што сама Тэкля кінулася ў ногі бацькі — нічога не дапамагло: той быў непрыступны, як скала. Казаў, што яна багатая шляхцянка, і ёй, адзінай дачцэ ў сям'і, патрэбна адпаведнае жыццё. А ў Касцюшкі ні багацця, ні прыстойнага жылля — што ён можа ёй даць? Пэўна ж, бацька даўно планаваў жаніха Тэклі, каб і самому штосьці перапала. Такія былі тагачасныя норавы.

Пры развітанні з болем у сэрцы Тадэвуш жадаў каханай Тэклі шчасця: «Няхай асвятляе цябе ўдача». А яна доўга плакала, але пайсці супраць волі бацькі не магла.

## ...Шчаслівае заканчэнне

Не трэба думаць, што гісторыя ведае толькі трагічныя прыклады кахання. Як цяпер, так і даўней людзі знаходзілі адно аднаго і да скону былі разам. Так спачатку проста сустракаліся, а потым узялі шлюб у 1841 г. у Вільні Валенцій Швыкоўскі і Гермінія з Ашмяншчыны і стварылі яшчэ адну ячэйку грамадства. Усё жыццё пражылі разам у Пружанах, шмат зрабілі для гэтага павятовага гарадка, для стварэння сваёй гарманічнай жыллёвай прасторы.

Гермінія займалася хатнімі справамі, а Валенцій — грамадскімі. Яны цудоўным чынам дапаўнялі адно аднаго. Экзатычны сад, багатая аранжарэя, парк, утульны палац захоўваліся дзякуючы пільнаму воку ды руплівасці гаспадыні. А ў вольную часіну яны разам прымалі гасцей або прагульваліся па рамантычным парку, ішлі да сажалкі з невялікім астраўком, дзе былі пастаўлены альтанкі. Ім было прыемна ад таго, што ўсё гэта яны стварылі разам. Іх сад — «гэта векавыя апельсіны, якіх быў вялікі лес, пальмы, міртры ды лімоны, якія былі вядомыя на ўсю Літву».

За ўсё жыццё ў іх так і не было дзяцей і «бацькоўская» любоў была скіравана на пляменніка Кастуся, які часта гасцяваў у доме Швыкоўскіх.

Граф Валенцій быў цікавай асобай. Дзякуючы яму ў Пружанах была адчынена публічная бібліятэка, конная пошта, цагляны і вінакурны заводы. Ён быў адукаванай і заўзятай асобай, меў «прекрасные душевные качества» (як пісалі пра яго тады): сумленны чалавек, патрыёт, удзельнік паўстання 1863 г., руплівы гаспадар, ініцыятыўны грамадзянін...

На 7 гадоў перажыў Валенцій сваю жонку, але былі яны пахаваны ў адной магіле ў Пружанах — у зямным і нябесным жыцці засталіся неразлучнымі назаўжды!

**Ірына ШЫМУКОВІЧ, студэнтка БДУ.**

# Міхаіл СІВАКОЎ: «Набыў цэлы заплечнік дапаможнікаў па італьянскай»

**Як вядома, паўабаронца барысаўскага БАТЭ і моладзевай зборнай Беларусі Міхаіл Сівакоў заключыў кантракт з клубам італьянскай серыі «А» «Кальяры». Трансфер разлічаны на чатыры гады. У новым клубе беларускі футбаліст будзе выступаць пад 16-м нумарам. 21-гадовы Міхаіл стаў пятым беларусам, які паспрабуе праявіць сябе ў Італіі. Да яго гэта зрабілі легендарны Сяргей Алейнікаў (у 1989 годзе), а таксама Сяргей Гурэнка, Віталь Кутузаў і Віталь Рагожкін. Сёння Міхаіл адказвае на нашы пытанні:**

**— Наколькі гэта прапанова была нечаканай ці была маральная гатоўнасць пакінуць Беларусь?**

— Я не рыхтаваўся, але жаданне паспрабаваць свае сілы ў еўрапейскім чэмпіянаце прысутнічала заўсёды. З'явіўся варыянт з «Кальяры», і я не шкадую, што яго выбраў, хоць быў яшчэ варыянт з украінскім «Дняпром», больш выйгрышны ў фінансавым плане. Італьянскі чэмпіянат — адзін з наймацнейшых, і я мяркую, што ўсё для мяне там складзецца добра. Я аптымістычна настроены.

**— І за месца ў аснове паспрачаецеся...**

— Натуральна, я так проста не саступлю, хаця і так проста мне яго ніхто не саступіць. Я разумею, што давядзецца шмат працаваць, спатрэбіцца нейкі перыяд на адаптацыю, але я гатовы да гэтага.

**— Дзе будзеце жыць у Італіі?**

— Першы час буду жыць у прадстаўніка клуба, які павінен паказаць мне, як дабірацца да базы, якая знаходзіцца за горадам, дапамагчы асвойтацца. Калі я адчую, што гатовы жыць адзін, пераеду на кватэру, якую адшукаў мне клуб.

**— З кім будзеце займацца італьянскай?**

— Мне знайшлі перакладчыка, гэта будзе мужчына. Растлумачылі, чаму: калі трэба будзе зайсці ў распранальню і штосьці перакласці, дзяўчына гэта зрабіць не зможа. З перакладчыкам пакуль не пазнаёміўся — калі ад'язджаў з Італіі, яго яшчэ не знайшлі, зараз мне паведамілі, што такі чалавек ёсць і гатовы прыступіць да заняткаў.

**— Размоўнік набылі?**

— Так, і яшчэ цэлы рукзак літаратуры.

**— Адчулі, з кім у новай камандзе можна пасябраваць?**

— Я магу размаўляць па-англійску, праўда, нямногія італьянцы ведаюць гэту мову. У камандзе ёсць бразілец і аргенцінец, якія таксама ведаюць англійскую. З імі і буду кантактаваць у найбліжэйшы час...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**


Фота Пятра ФАМІНА.

# Дыскатэка, студэнт і яго грошы: незвычайнае трохбор'е ў звычайным жыцці

Выйшла я неяк з крамы, зазірнула ў сваю кішэнь — і зразумела, што там вецер гуляе: ад мінулай стыпендыі ўжо даўно нічога не засталося, наступная яшчэ далёка наперадзе, а тых грошай, што далі бацькі, чамусьці, хапіла толькі на тыдзень, хоць разлічаныя яны былі на два, а то і тры. А тут яшчэ гэты сабантуй, які запланавалі мае сяброўкі, ды толькі мяне пра яго папярэдзіць забыліся. Дыскатэка, столік, выпіць, закусіць і гэтак далей — абавязковыя атрыбуты, якія суправаджаюць кожны падобны адпачынак. І ўсё гэта каштуе грошай. А дзе ж іх узяць?! Дзяўчатам дык яшчэ так-сяк. Можа, хлопцы якія добрыя трапяцца ды пачастуюць чым смачным, ды са столікам вырашаць усе праблемы? Гэта магчыма. Таму дзяўчаты ў гэтым сэнсе больш шчаслівыя. А вось хлопцам трэба раскашэліцца. Праўда, па дыскатэках звычайна соўгаюцца студэнты, якія добра, што хоць за ўваход заплаціць змогуць, а не тое што... Безумоўна, ёсць студэнты працуючыя, якія могуць сабе дазволіць тое ці іншае, напрыклад, паехаць на таксі дахаты ўжо пасля дыскатэкі, калі проста не ў стане дачакацца, ці, што самае галоўнае, наогул знайсці патрэбны нумар грамадскага транспарту, які б ішоў менавіта туды, куды трэба.

Але гаворка наша пойдзе не пра гэтых студэнтаў-«буржуяў». Мяне цікавіць **сярэднестатыстычны студэнт**. Той самы, які чакае стыпендыі як Бога, таму што прыйшоў час плаціць за некалькі месяцаў пражывання ў інтэрнаце і ў дадатак да гэтага скончыліся грошы на мабільніку, што не дазваляе патэлефанаваць дадому і пакленчыць грошай у бацькоў. Ды і халадзільнік таксама не радуе сваім выглядам: мыш там павесілася ўжо даўно, а на пахаванне яе патрэбныя сродкі. Гэта, вядома ж, гумар такі чорны, студэнцкі, але заснаваны ён на сапраўдных жыццёвых фактах.

Дык вось, пастаяла я каля крамы, падлічыла суму, якая яшчэ валяецца ў маім кашальку. Дзякуй Богу, на адпачынак хопіць, хоць на яго пачатак. А што будзе далей — там пабачым. Тым больш, што за мэту я сабе ўзяла толькі паразмаўляць з такімі ж студэнтамі, як і сама. На **начной дыскатэцы** іх хопіць і нават з гакам. А пад рытмы музыкі, якія гарачаць мацней за напоі, і гутарка будзе шпарчэйшай і больш прыемнай, ды і людзі становяцца больш вясёлымі. Дык вось. Селі мы з сяброўкамі ў свой любімы аўтобус нумар... які менавіта — гэта не так важна, як і назва таго клуба, у які мы трымалі курс. Скажу толькі адно. Пашанцавала нам у тым плане, што за ўваход на дыскатэку мы не плацілі, бо маем спецыяльныя запрашальныя карты, якія даюць права бясплатнага ўваходу. А гэта скінула б з нашага «разліковага рахунку» па меншай меры **тысяч трыццаць**, бо адпачынак наш прыпаў на суботу. Ды і, шчыра кажучы, мне асабіста было б шкада аддаваць такую суму толькі ў якасці платы за адзін уваход на дыскатэку. Лепей купіць сабе нешта смачнае. Але гэта толькі асабіста мая думка. Шанцуе ў гэтым плане нямногім — такія вось віп-карткі маюць лічаныя людзі. Праходзім далей. Служба аховы, якая цябе правярае ад і да, гардэроб, зала, танцпол... Вядома ж, стаяць усю ноч не надта хочацца, таму бяром столік. У кожным клубе цана на адну персону розная. Вагаецца ў асноўным **ад 5 да 20 тысяч**. Але гэта толькі на аднаго чалавека. Бяром у сярэднім дзясятку. Таксама цана за столік залежыць і ад месца: віп-месца цягне на суму паболей, там ніхто не будзе перашкаджаць. Такія столікі каштуюць **15-20 тысяч**. Але ж мы студэнты. Які можа быць віп?! Што маем у выніку? 30 тысяч за ўваход плюс 10 за столік. У суме выходзіць 40. Ужо нядрэнна трэба раскашэліцца. Але ж гэта толькі голы столік. Трэба ж яшчэ, што называецца, накрыць «паляну». **Піва каштуе 3 тысячы**, але не скажу, што яно найвышэйшага гатунку. Праўда, беларускае. Але — гэта на аматара. **Піца**, таксама ў залежнасці ад віду і памеру, пацягне **на 15-25 тысяч**, якія-небудзь **салодкія штучкі ад 5 да 10**. Гэта можа быць марожанае, фруктовае асарці, шакалад і гэтак далей. Гэта толькі так, сесці і пасядзець для знаёмства. Але, як мне здаецца, сярэднестатыстычнаму студэнту ўжо і гэта будзе надта вялікая раскоша. Прасцей, калі кампанія складаецца з некалькіх чалавек. Можна раскінуць суму на ўсіх. Атрымаецца танней.

А зараз падвядзём вынікі нашага эканамічнага назірання. Значыць, 40 тысяч за ўваход і столік, плюс піва за 3 тысячы, далей піца, каб закусіць гэта самае піва, кава, сокі яшчэ за 15 тысяч... **Усяго атрымалася каля 60 тысяч**. Плюс, мінус... І гэта толькі адпачынак у клубе. А транспартныя паслугі? Калі таксі — дык яшчэ ў прыдачу дваццатка, калі ж грамадскі транспарт, то 1200 рублёў: туды і назад, два талончыкі. Пагадзіцеся, што сума атрымалася значная. Гэта палова ўсёй маёй стыпендыі. Дык на месяц такіх трэба самае малое з паўтузіна.

Кошт коштам, але ж цікава было мне пачуць, што называецца, з першых вуснаў пра рэальныя траты сённяшніх студэнтаў. Таму нічога не заставалася, як рвануць у натоўп, выйсці ў народ. Менавіта на танцполе ішла мая гутарка з ужо вясёлымі і кантактнымі адпачывальнікамі. Нешта мне не надта верылася, што наш студэнцкі народ — такія багацеі. Меню ў клубах, як падаецца мне, разлічана на дзядулькаў з тоўстымі кашалькамі і ні ў якім разе не на студэнта. Вось і спыталася я ў іх саміх.

Напрыклад, **Саша з Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта**, пастаянны наведвальнік гэтай дыскатэкі, паведаміў мне, што амаль ніколі нічога не бярэ ў клубе, бо тут надта высокая нацэнка. Тое ж самае піва можна купіць у звычайным краме амаль у два разы танней. Ці нейкія іншыя спіртныя напоі, шакаладкі, цыгарэты... «Паколькі стыпендыя ў сённяшняга студэнта не тое, што не надта высокая, яе, можна лічыць, амаль не існуе, — кажа Саша. — А тое, што мы атрымліваем — гэта так, схадзіць адзін раз у краму і амаль нічога не купіць. Я падкрэсліваю: амаль нічога. Не, ну самае неабходнае можна набыць. Але шкада, што хапае стыпендыі толькі на адзін паход па пакупкі. Дык вось менавіта таму прыходзіцца эканоміць».

Вядома ж, мне стала цікава, якім жа гэта метадам Саша эканоміць на дыскатэцы. Каб і паесці, і папіць, і выпіць?! Аказваецца, усё неабходнае закупляецца непасрэдна перад самой дыскатэкай. А вось калі гэта ўсё з'есці і выпіць — вырашаецца пасля вызначэння з самой дыскатэкай. Калі існуе магчымасць ва ўжо нецвярозым стане не прайсці на дыскатэку (ну мала які трапіцца фэйс-кантроль!), то ўсё загатаванае раней проста прыхоўваецца дзесьці пад лавачкай, дзе спакойна ляжыць і чакае свайго часу. А ўжо пазней трэба проста выйсці, дастаць свой пакецік і павячэраць. А калі дыскатэка праверанная, то можна зрабіць апусташэнне пакеціка і перад уваходам на яе. Вось як усё проста. Такое прыдумаць маглі толькі сапраўдныя студэнты.

**Людміла з Міжнароднага дзяржаўнага эканамічнага інстытута** кажа, што звычайна яна столік не бярэ. «А навошта ён мне? — здзіўляецца дзяўчына. — Я прыходжу на дыскатэку патанчыць, адпачыць, расслабіцца. А не напіцца да страты пульсу. Не, ну я, вядома ж, выпіваю як і ўсе, для паднятця настрою. Але звычайна ўсё неабходнае бяру на бары. Ці то тую **«Адвёртку»** (якая, дарэчы, каштуе **ад 5 да 7 тысяч**. Гэта таксама ў залежнасці ад клуба. — **Аўт.**). А калі надта хочацца піць, дык можна ўзяць які-небудзь «Спрайт» ці «Банакву» (гэтыя напоі каштуюць амаль нараўне з півам. Розніца — рублёў 500. Тлумачыцца гэта тым, што дыскатэка — месца, дзе заўсёды горача і хочацца піць. — **Аўт.**). А ем на дыскатэках зрэдку. Я ж прыйшла калорыі скідваць, а не набіраць».

А вось наконт «пасядзець», то тут асобная гаворка. Для тых людзей, якія не ўзялі столік (а іх проста-такі на ўсіх ахвотных можа і не хапіць), прадугледжаныя спецыяльныя месцы, дзе можна, так сказаць, прызямліцца і адпачыць. Такія месцы ёсць амаль на ўсіх дыскатэках. Дык часцей бывае так, што той, хто стаміўся, ад'язджае дахаты, а самыя стойкія танцуюць.

А вось **Андрэй з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта** паведаміў мне, што можа пакінуць значную суму на дыскатэцы і не пашкадаваць пра гэта. Стыпендыі не хапае, гэта само сабой. Вось і працуе хлопец, каб можна было дазволіць сабе такую раскошу, як начная дыскатэка. «А чаму не, — кажа Андрэй. — Я працую, кожны дзень змагаюся са сваім фінансавым крызісам пры дапамозе працы, працы і яшчэ раз працы. Таму лічу нармальнай такую з'яву, як транжырства грошай менавіта на дыскатэцы. А чаму б і не?!

Праўда, сума ў мяне заўсёды азначаная. Тая, якую я магу сёння патраціць. Плюс, мінус... Заўсёды падыходжу да гэтай справы з розумам. А то, калі транжырыць без планавання, то і працаваць бескарысна».

Вось такое даследаванне зместу студэнцкага кашалька і памеру ўкладаў у дыскатэчныя дэпазіты ў мяне атрымалася. Шчыра кажучы, пасля такіх падлікаў я зазірнула ў свой кашалёк, пералічыла апошнія кроўныя і вырашыла, што транжырству з гэтага часу — бой. Не для таго мае бацькі працуюць, каб я іх працу пакідала ў касах начных дыскатэк. Мне да сэрца блізкі метад Сашы з БНТУ, які робіць па-хітраму. Што называецца, і ваўкі сытыя, і козы цэлыя. А такую суму пакідаць на начной дыскатэцы — гэта, на мой погляд, проста глупства і буржуйства. Так што памятай, студэнт, пустая кішэнь — гэта вынік твайго і толькі твайго стаўлення да працы і адпачынку.

**По начных дыскатэках хадзіла студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## СУМЕСНАЕ ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «ХЕНКЕЛЬ БАУТЭХНІК»:

# ЯКАСЦЬ ДЛЯ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ





У Марыны КАРАНЕВІЧ і Анастасіі ТЫШКЕВІЧ пасады адказныя — яны бухгалтары. Паспяховасць спраў вытворчасці адлюстравана на добразычлівых, усмешлівых тварах маладых супрацоўніц.

**Яшчэ ў снежні 2006 года СТАА «Хенкель Баутэхнік» было ўключана ў Дзяржаўную праграму імпартазамяшчэння да канца 2010 года. Прыемна, што завод з гэтай адказнай місіяй спраўляецца, выпускаючы шырокі асартымент будаўнічых матэрыялаў.**

**Беларускі рынак будаўнічых матэрыялаў па-ранейшаму вызначаецца багатым і разнастайным асартыментам якаснай прадукцыі, якая мае надзвычай шырокае прымяненне ў рамонтна-будаўнічай сферы і заўсёды з'яўляецца запатрабаванай. Сярод знакавых ігракоў на гэтым полі — Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Хенкель Баутэхнік», якое ўжо не адзін год адрозніваецца ад сваіх канкурэнтаў высакаякаснай прадукцыяй і з'яўляецца адным з лепшых у фармаце «цана-якасць».**

**Прадпрыемства пачало свой адлік у Беларусі ў 2004 годзе, як падраздзяленне нямецкай будаўнічай хіміі «Хенкель» з гандлёвай маркай Ceresit. Устойлівы попыт на прадукцыю Ceresit прывёў кампанію да прыняцця рашэння аб будаўніцтве ўласнага завода па вытворчасці будаўнічых сумесяў у Заслаўі. Задумана — зроблена. Першы камень у фундамент новага завода быў закладзены ў чэрвені 2005 года. Будаўніцтва вялося вельмі інтэнсіўна і было завершана ў рэкордна сціслыя тэрміны. У верасні 2006 года з канвеера прадпрыемства сышла першая прадукцыя маркі Ceresit.**

**Сёння можна ўпэўнена сцвярджаць, што СТАА «Хенкель Баутэхнік» з'яўляецца ўнікальным прадпрыемствам не толькі з пункту погляду тэхнічнага аснашчэння і асартыменту прадукцыі, якая задавальняе патрэбы ў якаснай і недарагой прадукцыі айчыннага рынку. Новае прадпрыемства па-свойму вырашае пытанні дзяржаўнай праграмы па адраджэнні малых гарадоў, выкарыстоўвае ў першую чаргу беларускую сыравіну і матэрыялы, а таксама ў поўнай меры выконвае праграму імпартазамяшчэння. Пра яго высокую рэпутацыю сведчыць устойлівы выраз: «Якасць для прафесіяналаў». Прыемна, што ў дачыненні да кампаніі «Хенкель», якую ўвасабляе сабой і беларускае прадпрыемства «Хенкель Баутэхнік», яно застаецца непахісным.**

**Доля мясцовай сыравіны ў выніковым прадукце складае 80—95 працэнтаў. Кошт будаўнічых сумесяў Ceresit, выраблены ў Беларусі, на 15—20 працэнтаў менш аналагаў, што экспартуюцца.**








### Цікава ведаць...

**Henkel** — гэта міжнародная група-кампанія са штаб-кватэрай ў Дзюсельдорфе (Германія). Заснавана ў 1876 годзе. Сёння міжнародны будаўнічы холдынг прадстаўлены больш чым у 125 краінах свету. Кампанія, у складзе якой працуюць 55 тысяч чалавек, пабудавала 180 заводаў. Яе гадавы абарот складае звыш 15 мільярдаў еўра.

**Henkel развівае сваю дзейнасць па трох асноўных напрамках:**

- Сродкі для дома (з гандлёвымі маркамі Prill, Persil, Bref, Vernel, Losk, Ласка)
- Сродкі асабістай гігіены (Taft, Fa, Shauma, GLISSKUR)
- Клей, герметыкі і сродкі для апрацоўкі паверхняў (Ceresit, Thomis, Metylan, Monent, Pritt)

**НАШЫ РЭКВІЗІТЫ:**
СТАА «Хенкель Баутэхнік»
вул. Будаўнічая, 1, г. Заслаўе
Мінскі раён, 223036
Тэл./факс: (017) 544 70 88
e-mail: info@henkel-bautechnik.by
www.henkel-bautechnik.by
УНП 690314863

Матэрыялы старонкі падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

### СТАА «Хенкель Баутэхнік»:

**Асноўныя этапы развіцця:**

- **2004 год (лістапад)** — рэгістрацыя Мінскім абласным выканаўчым камітэтам СТАА «Хенкель Баутэхнік». Асноўная мэта стварэння прадпрыемства — арганізацыя вытворчасці ў Рэспубліцы Беларусь імпартазамяшчальных будаўнічых матэрыялаў гандлёвай маркі **Ceresit.**
- **2005 год (чэрвень)** — пачатак будаўніцтва завода па выпуску будаўнічых сумесяў **Ceresit** у Заслаўі (Мінскі раён).
- **2006 года (верасень)** — датэрміновае завяршэнне будаўніцтва, пачатак уласнай вытворчасці.

Праектная магутнасць — 100 тысяч тон у год. Прадпрыемства аснашчана лепшым еўрапейскім абсталяваннем.

- **2006 год (снежань)** — уключэнне прадпрыемства ў Дзяржаўную праграму імпартазамяшчэння на 2006—2010 гг. (пісьмо Міністэрства эканомікі Беларусі № 20-01/10-50-82 ад 04.12.2006 г.).
- **2008 год (май)** — уключэнне прадпрыемства ў Дзяржаўную комплексную праграму развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2007—2010 гады (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19.05.2008 г. № 281). Атрыманыя льготы выкарыстоўваюцца на запуск другой аўтаматычнай вытворчай лініі і стварэнне 20 дадатковых працоўных месцаў.
- **2008 год (верасень)** — адкрыццё пад патранатам Міністэрства адукацыі Беларусі спецыялізаванага Навучальнага цэнтра **Ceresit** на базе ПТВ № 52 імя І.М. Жыжаля ў г. Мінску за кошт інвестыцый кампаніі «Хенкель Баутэхнік» у аб'ёме каля 50 млн рублёў.
- **2009 год** — запланаваны выпуск 40 тысяч тон сумесяў. Наладжаны выпуск 28 прадуктаў, да канца года мяркуецца асвоіць 34 прадукты, 90 працэнтаў з якіх — імпартазамяшчальныя.

Колькасць працоўных месцаў на СТАА «Хенкель Баутэхнік»: **2005 год** — 23, **2006 год** — 72, **2007 год** — 108, **2008 год** — 126



Агульны партрэт калектыву можна ўявіць, гледзячы на гэтыя фотаздымкі. Сённяшні працаўнік — чалавек высокакваліфікаваны (як патрабуюць укаранёныя тут сучасныя тэхналогіі), часцей за ўсё маладых гадоў, з усведамленнем уласнай адказнасці за вынік агульнай працы. Менавіта такія рысы прысутныя героям гэтых фотаздымкаў. Вольга КАРТАШОВА працуе над улікам матэрыялаў — па-за яе ўвагай не застаецца ніводны кілаграм з вялікіх аб'ёмаў кампанентаў, якія паступаюць у цэхі прадпрыемства. Укладчыкі Дзяніс ПАЎЛОВІЧ і Аляксандр САКОВІЧ забяспечваюць бесперабойную працу на ўчастку, дзе сумесь для склейвання засыпаецца ў пакеты. Укладчыка Аляксея РОЖЫНА і майстра змены Аляксея ПАВАРОТНАГА мы ўбачылі на ўчастку, куды дастаўляецца гатовая прадукцыя. Неўзабаве яна будзе адгружана заказчыкам — таму нялішне яшчэ раз праверыць якасць упакоўкі.

### СТАА «Баутэхнік Хенкель»

**Першапачатковыя інвестыцыі ў будаўніцтва завода СТАА «Хенкель Баутэхнік» у г. Заслаўі склалі 6,5 мільёна еўра, з якіх:**

- будаўніча-мантажныя работы — 4,15 млн еўра
- тэхналагічнае абсталяванне (Швецыя, Германія, Італія) — 2,0 млн еўра
- ачышчальныя збудаванні — 250 тыс. еўра
- рэканструкцыя дарог з г. Заслаўі — 100 тыс. еўра
- планаваныя інвестыцыі на 2008—2009 гг. — 2 млн еўра

**Магутнасці завода будаўнічых сумесяў СТАА «Хенкель Баутэхнік» разлічаны на вытворчасць 100 тысяч тон прадукцыі ў год і на 230 працоўных месцаў. Прадпрыемства па праву носіць назву Hi-Tech, бо аснашчана перадавымі тэхналогіямі і сучасным абсталяваннем. На прадпрыемстве ўсталяваны самыя сучасныя сістэмы ачышчальных збудаванняў. Рэгулярна праводзіцца ачыстка паветра, дажджавых і гаспадарчых стокаў. На сёння на заводзе працуе 126 чалавек. Да 2010 года колькасць супрацоўнікаў вырасце амаль удвая.**

**СТАА «Хенкель Баутэхнік» пачынала ўласную вытворчасць у 2006 годзе з аб'ёму 368 тон. Мяркуецца, што ў 2010 годзе гадавы выпуск складзе каля 70 тысяч тон самай разнастайнай прадукцыі.**

**На сёння асартымент прадукцыі Ceresit складаецца з 6 груп:**

- матэрыялы для абліцоўкі;
- матэрыялы для ўстройства і рамонту падлог;
- матэрыялы для гідраізаляцыі;
- матэрыялы для аздаблення і ўцяплення фасадаў;
- спецыяльныя матэрыялы
- пены, герметыкі.

Мяркуецца, што кожны год асартымент выпускаемай прадукцыі будзе пашырацца на 5-7 новых прадуктаў.



**СТАА «Хенкель Баутэхнік» праводзіць бясплатныя семінары для спецыялістаў будаўнічай галіны па правільным прымяненні матэрыялаў Ceresit, а таксама накіроўвае на навучанне ў Цэнтр Ceresit на базе ПТВ № 52 у г. Мінску з выдачай сертыфіката аб праходжанні адпаведнага курса.**

**Выпрабавальная лабараторыя СТАА «Хенкель Баутэхнік» сертыфікавана на адпаведнасць крытэрыям Сістэмы акрэдытацыі Беларусі і патрабаванняў СТБ ISO/МЭК 17025, здзяйсняе пастаянны строгі кантроль за захаваннем тэхнічных характарыстык прадукцыі, якая выпускаецца.**

### Навінкам — дарогу

У 2008 годзе да наяўных 28 прадуктаў беларускай вытворчасці прыбавіліся новыя прадукты Ceresit — бесколерная грунтоўка Ceresit CT 17 SuperGrunt; ахоўна-апрацоўчыя тынкоўка Ceresit CT 36 (структурная фактура) і Ceresit CT 137 (фактура камешкавая, зерне 1,5 мм і пад акрас), клей для прыклейвання ўцяпляльніка ў зімовых умовах Ceresit CT 85 «зіма».

Уся лінейка прадуктаў, якія выпускаюцца на СТАА «Хенкель Баутэхнік», вызначаецца зручнасцю ў карыстанні, павышанай трываласцю да самых розных умоў надвор'я, надоўга захоўвае прывабны эстэтычны выгляд і мае ў параўнанні з аналагамі перавагу ў сістэме «цана-якасць».







Выдатны новы прадукт выглядзе эластычнай клеючай сумесі. Гэта танкаслойны раствор для прыклейвання керамічнай пліткі з нізкім водапаглынаннем. Дык вось, па цане ён у разы больш танны за імпартныя аналагі, а па сваіх уласцівасцях ні ў чым не горшы, а нават лепшы.

**Кампанія не спыняецца на дасягнутым. Да запуску ў вытворчасць у 2009 годзе гатовыя рэцэптуры 5 прадуктаў, і гэта яшчэ не ўсё...**

### Henkel гарантуе

Складаныя задачы патрабуюць прафесійных рашэнняў. Кампанія Henkel як адзін з сусветных лідараў у галіне будаўнічай хіміі з асартыментам больш чым 120 арыгінальных будаўнічых сумесяў Ceresit заўсёды прапануе слушныя парады ў пошуках выйсця.

Адзін з законаў сусветнага будаўнічага брэнда — выпуск якаснага прадукту ў любой краіне планеты і аднолькавы падыход да кожнага спажыўца. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да Беларусі. Гэта не высокія словы, а жыццёвыя рэаліі. Па-першае, завод у Заслаўі абсталяваны па самым сучасным еўрапейскім патрабаванні. Па-другое, уся прадукцыя, якая выпрабляецца, праходзіць строгі кантроль уласнай лабараторыі: пачынаючы з кантролю кожнай партыі сыравіны і заканчваючы кантролем якасці кожнага замесу. Па-трэцяе, якасць гатовай прадукцыі знаходзіцца пад пастаянным кантролем Дэпартамента развіцця і даследаванняў Хенкель (г. Уна, Германія). Дэпартамент РіД праводзіць выпрабаванні рэцэптур беларускіх прадуктаў маркі Ceresit на стадыі іх распрацоўкі, а таксама рэгулярныя выпрабаванні выробленай прадукцыі. Па-чацвёртае, пры вытвочасці прадукцыі дзейнічае двайная сістэма стандартаў: Айчынны Ceresit правяраецца на адпаведнасць як беларускім, так і Еўрапейскім нормам.



Пасля таго, як звычайны пясок паступіў у цэх прадпрыемства на першую падрыхтоўчую аперацыю (на здымку — унізе), ён і іншыя кампаненты будучай прадукцыі знаходзяцца пад уважлівым кантролем выпрабавальнай лабараторыі. Ад працы гэтага невялікага калектыву ў многім залежыць якасць сумесі і клею. На здымку ўверсе — начальнік выпрабавальнай лабараторыі Алена ЯФІМЕНКА і лабарант Дзяніс ДЗІКЕВІЧ. На здымку побач — інжынер-хімік Вера УРУБЛЕЎСКАЯ. Іх фотааб'ектыў убачыў падчас доследаў.

### Пар касцей не ломіць...

Відавочна, што гэты народны выраз, які ўжо даўно стаў крылатым, паспрыяў таму, каб на СТАА «Хенкель Баутэхнік» занялiся праблемай уцяплення жылога і нежылога фонду. Калі без жартаў, то тэма захавання цяпла на парадку дня практычна ўсіх прадпрыемстваў і арганізацый самых розных формаў уласнасці. Не дзіўна, што ў рэспубліцы штогод уцяпляецца больш за 2 мільёны кв.м фасадаў будынкаў. Кампанія «Хенкель Баутэхнік», з'яўляючыся вытворцам прафесійных будаўнічых сумесяў гандлёвай маркі Ceresit у Рэспубліцы Беларусь, таксама надае прыярытэтнае значэнне вытворчасці прадуктаў, што прымяняюцца для ўцяплення будынкаў.

Фасадныя сістэмы ўцяплення Ceresit — Ceresit WM і Ceresit VWS — адносяцца да вонкавых сістэм уцяплення «лёгка-мокрым» спосабам. У такіх сістэмах уцяпляльнік мацуецца звонку будынка цэментнымі клеявымі растворамі, на паверхні ўцяпляльніка з такіх жа клеявых раствораў выпрабляецца трывалаабарончы слой, арміраваны шкловатай, затым выконваецца дэкаратыўная апрацоўка фасада танкаслойнымі тынкоўкамі.

**Сістэма ўцяплення Ceresit — Ceresit WM і Ceresit VWS даўгавечныя. Як паказвае вопыт прымянення сістэм уцяплення Ceresit у Еўропе, тэрмін іх эксплуатацыі без пагаршэння тэхнічных характарыстык і неабходнасці рамонту складае звыш 50 гадоў.**

Ужо ў першы год работы завода кампаніі ў Заслаўі ў вытворчую праграму былі ўключаны ўсе прадукты Ceresit, неабходныя для ўцяплення будынкаў як на базе мінеральнай ваты, так і на базе пенапалістыролу. Распрацавана і зацверджана ўся неабходная тэхнічная дакументацыя, тэхналагічныя карты на ўстройства цеплавой ізаляцыі, гідраізаляцыйных работ будаўнічымі сумесямі Ceresit з прымяненнем пенапалістыролу, па выніках якога атрымана Заключэнне аб прымяненні па ўмовах пажарнай бяспекі сістэмы ўцяплення вонкавых сцен будынкаў сістэмай Ceresit.

Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь уведзены ў дзеянне шэраг дакументаў, якія пацвярджаюць прыдатнасць прадукцыі аднайменнай маркі для ўцяплення.

Зараз кампанія «Хенкель Баутэхнік» выходзіць на новы, яшчэ больш высокі ўзровень развіцця, адкрываючы ў абласных цэнтрах рэспублікі спецыялізаваныя цэнтры ўцяплення.

Цэнтр уцяплення Ceresit — гэта поўны сэрвіс па выбары матэрыялаў і камплектацыі аб'ектаў аднайменнымі сістэмамі ўцяплення.

Тут можна не толькі набыць усе неабходныя матэрыялы для ўцяплення, заколераваць фарбу ці штукатурку, але і атрымаць бясплатную кваліфікаваную кансультацыю спецыялістаў Цэнтра па правільным выбары сістэмы ўцяплення, тыпу і таўшчыні ўцяпляльніка, атрымаць разлік патрэбы ў матэрыялах пад канкрэтны аб'ект.

Цэнтры ўцяплення Ceresit праводзяць бясплатныя семінары для спецыялістаў будаўнічай галіны па правільным прымяненні матэрыялаў Ceresit, а таксама накіроўваюць на навучанне ў Цэнтр Ceresit на базе ПТВ № 52 у г. Мінску з выдачай сертыфіката аб праходжанні адпаведнага курса.

Цэнтры ўцяплення Ceresit арганізоўваюць выезд сваіх спецыялістаў на аб'ект тэхнічнага кансультавання непасрэдна ў месцы выканання работ. У многіх Цэнтрах арганізавана бясплатная дастаўка матэрыялаў непасрэдна на аб'ект.

На сёння Цэнтры ўцяплення Ceresit адкрыты ў Магілёве, Гомелі, Брэсце і Мінску. У найбліжэйшых планах кампаніі — адкрыццё аналагічных цэнтраў у астатніх абласных, а таксама ў буйных раённых цэнтрах.

Ceresit
СІСТЭМА ЎЦЕПЛЕННЯ



Гэтыя фотаздымкі зроблены на розных участках прадпрыемства. Агульнае для ўсіх, хто «патрапіў» у аб'ектыў — высокі рытм працы і ўзаемная зладжанасць. Вадкая прадукцыя паступае на лінію, дзе разліў ідзе пад наглядам Аляксандра МАКАРЭВІЧА. Аляксандр ЧАЕЎСКІ кіруе ўстаноўкай па расфасоўцы клейкай сумесі для абліцовачнай пліткі. Леаніду ЦІМАШЭНКУ даручана разгрузка.

